

ГЛЫБІНКА — ЛАКАМАТЫЎ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ?

МС

КАБ МЕНШ ПЛАЦІЦЬ ЗА ЦЯПЛО

МС




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 189 (29056)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:**

*«Работа прызыўных камісій, па маёй інфармацыі, ідзе планава, нейкіх асаблівых праблем няма. Пытанні, якія ўзнікаюць, вырашаюцца ў рабочым парадку. Прызыўнікоў будзе больш, для гэтага і прымаліся папраўкі. Гэта — баявая гатоўнасць арміі. Усе адтэрміноўкі для працягу адукацыі, дадзеныя да ўступлення ў сілу закона, будуць захоўвацца да страты падстаў, па якіх яны атрыманы».*

## КОРАТКА

• **Мужчыны складаюць усяго каля 14 % работнікаў сістэмы адукацыі Беларусі.**

• Еўрапейскі аўтамабільны кангрэс пройдзе ў Мінску 7—10 кастрычніка.

• **«Белавія» прапануе пасажырам новую паслугу — папярэдні выбар месца ў салоне самалёта за дадатковую плату.**

• У лесе пад Мінскам у спустошаным стане знойдзена 28-гадовая жыхарка пасёлка Чысць Мінскай вобласці Анастасія Герко. Усе дзевяць дзён яна блукала ў лясным масіве.

• **Жыхарка Слуцкага раёна прадстаўлялася знахаркай і брала за «зняцце сурокаў» ад $250 да $999. Узбуджаная крымінальная справа.**

• У Пінску 14-гадовы веласіпедыст трапіў пад цягнік. Юнак быў у слухаўках і сігналаў цягніка не чуў.

# На агульнай мове

## У Житоміры пачаўся II Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны

**Сёння ў міжнародным мерапрыемстве прыме ўдзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Запланавана выступленне кіраўніка дзяржавы на пленарным пасяджэнні форуму, якое будзе прысвечана патэнцыялу ўзаемадзеяння дзвюх краін праз прызму развіцця міжрэгіянальных сувязяў. Чакаюцца таксама перагаворы з Прэзідэнтам Украіны Уладзімірам Зяленскім, абмеркаванне актуальнага стану і перспектыў развіцця беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва ў розных сферах, абмен думкамі па пытаннях рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня.**


СТАР. 2




Фота БелТА.

# РОДНЫЯ ЛЮДЗІ



**У вёсцы Басянкі Мёрскага раёна жыве некалькі беларуска-ўкраінскіх сем'яў. На гэтым фота — адна з такіх: малады бацька Валерый ЛАТЫШЭНКА з дзецьмі і цешчай Агаф'яй ФУРС, якая родам з Прыкарпацця. Трохгадовыя Іван і Ксенія — ужо трэцяе пакаленне. У іх таксама цячэ і ўкраінская, і беларуская кроў. А гісторыя з'яўлення нашых паўднёвых суседзяў у гэтым кутку Віцебшчыны банальная. Калісьці ў Басянках быў заможны калгас, і на лета сюды на работу прыязджалі украінскія дзяўчаты. Для некаторых з іх Беларусь стала радзімай. Хіба гэта не шчаслівы паварот лёсу?! У свой час Агаф'я Фурс выйшла за беларуса. Яе дачка пабралася шлюбам таксама з беларусам. І па-суседстве з Латышэнкамі і Фурсамі жыве яшчэ адна беларуска-ўкраінская сям'я — Паўла і Алены ШАМРОВІЧАЎ.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Як жыве інтэрнацыянальная вёска — глядзіце ў фотарэпартажы «Восень у Басянках» на сайце zviazda.by.*

Нашы грошы

# УСЯГО 25, А ЎЖО З ГІСТОРЫЯЙ

## Упершыню на суд грамадскасці была выстаўленая экспазіцыя беларускіх талераў, той валюты 90-х, якая так і не была надрукавана



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**25 гадоў таму, у кастрычніку 1994 года, Вярхоўны Савет нашай краіны падпісаў пастанову, якая заканадаўча замацавала беларускі рубель у якасці адзінага плацежнага сродку на тэрыторыі Беларусі. У рамках святкавання гэтага юбілею ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея нашай краіны «Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці» адбылося адкрыццё часовай выстаўкі «Беларускі рубель. Гісторыя ў чвэрць стагоддзя».**

«За гэты перыяд беларускі рубель і нацыянальная грашовая сістэма прайшлі складаны шлях станаўлення і развіцця, перажыўшы перыяд гіперінфляцыі, шэраг інфляцыйных усплёскаў і дэнамінацый. Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што беларускі рубель — гэта атрыбут самаідэнтыфікацыі і культуры нашай нацыі, прыкмета незалежнасці і сілы беларускай дзяржавы», — сказала на адкрыцці выстаўкі **галоўны спецыяліст гісторыка-інфармацыйнага аддзела кіравання і грамадскіх сувязяў Нацбанка Беларусі, дырэктар Музея грошай Аляксандра ВАРАБ'ЁВА.**


СТАР. 4



ISSN 1990 - 763X
19189>
9 771990 763008

# На агульнай мове

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Напярэдадні падчас інтэрв'ю прадстаўнікам украінскіх СМІ беларускі лідар адзначыў, што сустрэча дасць магчымасць не проста пазнаёміцца асабіста на чалавечым узроўні, але і лепш зразумецца і дамовіцца пра пазіцыю адзін аднаго па тых ці іншых пытаннях.

Другі ў гісторыі Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны пачаўся ўчора з чаргового пасяджэння беларуска-ўкраінскага кансультатыўнага савета дзелавога супрацоўніцтва з удзелам кіраўнікоў абедзвюх гандлёва-прамысловых палат і паслоў дзвюх краін. Пасля адбыліся бізнес-перамовы, падпісаны дзелавыя кантракты і пагадненні, прайшло пасяджэнне сумеснай камісіі па каардынацыі пытанняў аховы і ўстойлівага выкарыстання трансгранічных прыродаахоўных тэрыторый, экафорум. Увечары ўдзельнікі форуму наведалі «Канцэрт дружбы».

Учора і сёння ў Жытоміры працуе выстаўка буйнагабарытнай тэхнікі беларускіх і ўкраінскіх прадпрыемстваў, у тым ліку навінкі. Сярод прадстаўленых адзінак тэхнікі ёсць і тыя, якія з'яўляюцца вынікам супрацоўніцтва дзвюх краін. Беларускі бок не выключае, што асобныя экспанаты знойдуць сваіх пакупнікоў непасрэдна на мерапрыемстве. Па суседстве арганізаваны кірмаш прадукцыі і вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі і Украіны.

Жытомір гэтымі днямі наведваюць дэлегацыі з усіх абласцей Беларусі і з 22 рэгіёнаў Украіны. Летась тавараабарот паміж краінамі склаў амаль 5,5 мільярда долараў. Вынікі першага форуму рэгіёнаў, які адбыўся ў Гомелі летась у кастрычніку, не прымусілі сябе чакаць. Аб гэтым на сустрэчы з прадстаўнікамі ўкраінскіх СМІ заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што менавіта гандлёва-эканамічныя адносіны — ключавы складнік беларуска-ўкраінскага партнёрства, і дасягненні тут значныя.

«Працуюць сумесныя прадпрыемствы, ёсць нямала агульных інфраструктурных праектаў. Нас аб'ядноўваюць цесныя кааперацыйныя сувязі. І трэба сказаць, што гэты працэс пастаянна ўзмацняецца, нарастае», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Чакаецца, што па выніках форуму будзе падпісаны шэраг дакументаў па развіцці міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння ў розных сферах, а таксама дамоўленасці на ўзроўні прадпрыемстваў.

**Паводле БелТА.**

## Тым часам

Дзелавыя колы і прадпрыемствы Беларусі і Украіны падпісалі некалькі дзясяткаў дакументаў на суму больш за $500 млн. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведаміў **старшыня БелГПП Уладзімір УЛАХОВІЧ** па выніках праведзенага ў Жытоміры восьмага пасяджэння двухбаковага кансультатыўнага савета дзелавога супрацоўніцтва.

Уладзімір Улаховіч нагадаў, што на І Форуме рэгіёнаў Беларусі і Украіны была ўзятая планка ў $140 млн. У Жытоміры ж, паводле яго слоў, падпісаны пагадненні на пастаўку беларускай прадукцыі на суму больш за $542 млн.

«Адкрыліся новыя кірункі, па якіх падпісаны кантракты. Гэта не толькі традыцыйная нафтахімія, машынабудаванне — гэта вялікая і будаўнічая сфера, лёгкая і харчовая прамысловасць. Гэта значыць, мы пашыраем наш экспартны партфель», — адзначыў старшыня БелГПП.

Нягледзячы на вялікую суму кантрактаў, ён лічыць, што ў Беларусі і Украіны ячшэ шмат перспектыў. «Вельмі запатрабаваная тэма, але яшчэ не да канца пераведзеная ў плоскасць канкрэтных праектаў, — інфраструктура, лагістыка і транспартныя калідоры. Пра гэта мы гаворым, гэта ў парадку дня. Але вельмі важна ўсё гэта перакласці на канкрэтныя праекты, таму што Беларусь і Украіна валодаюць вельмі магутным лагістычным патэнцыялам», — адзначыў Уладзімір Улаховіч.




## ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 5 кастрычніка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 у суботу іх правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША мяркуюць правесці ў Еўропе найбуйнейшыя з часоў халоднай вайны вучэнні



Злучаныя Штаты плануюць правесці ў Еўропе найбуйнейшыя з часоў халоднай вайны ваенныя вучэнні. Пра гэта заявіў кангрэсмен-дэмакрат ад штата Каліфорнія Джон Гарамендзі, член камітэта Палаты прадстаўнікоў па справах узброеных сіл, выступаючы на пасяджэнні Варшаўскага форуму па бяспецы.

«ЗША ў супрацоўніцтве з іншымі краінамі правядуць самыя буйныя з часоў халоднай вайны еўрапейскія ваенныя вучэнні», — паведаміў ён. «Мэта гэтых вучэнняў — умацаванне нашай абароны і ўзаемадзеяння саюзнікаў», — падкрэсліў кангрэсмен.

«Кангрэс лічыць, што НАТА мае ключавое значэнне для нашай і вашай бяспекі, — сказаў Джон Гарамендзі, звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму і заклікаўшы расійскія ўлады «нават не сумнявацца ў амерыканскай прыхільнасці НАТА».

### СМІ: сотні праціўнікаў «формулы Штайнмаера» сабраліся каля офіса прэзідэнта Украіны



Каля 700 чалавек сабраліся на акцыю пратэсту супраць падпісання «формулы Штайнмаера» каля офіса прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага. Пра гэта паведамляе выданне «Украінскія навіны».

Паводле яго звестак, пратэстоўцы лічаць узгадненне «формулы Штайнмаера» «шляхам да капітуляцыі» і патрабуюць адстаўкі прэзідэнта. Усе ўваходы ў офіс прэзідэнта ахоўвае паліцыя, абстаноўка каля будынка спакойная. Мітынг пачаўся пасля брыфінгу кіраўніка дзяржавы Уладзіміра Зяленскага, на якім той пацвердзіў узгадненне «формулы Штайнмаера».

У аўторак па выніках пасяджэння кантактнай групы па ўрэгуляванні канфлікту ў Данбасе паўнамоцны прадстаўнік Расіі Барыс Грызлоў паведаміў, што ўсе ўдзельнікі ўзгаднілі «формулу Штайнмаера», адзначыўшы, што «такім чынам узгоднены парадак увядзення ў дзеянне закона аб асаблівым статусе асобных раёнаў Данецкай і Луганскай абласцей».

### Апытанне: больш за палову амерыканцаў супраць распачатай дэмакратамі працэдуры імпічменту Трампа

Больш за палову амерыканцаў выказваюцца супраць распачатай дэмакратамі ў Кангрэсе працэдуры імпічменту прэзідэнта Дональда Трампа, хоць колькасць тых, хто лічыць такі варыянт пажаданым, за апошні месяц вырасла. Пра гэта сведчаць вынікі апытання даследчай службы Монмуцкага ўніверсітэта.

Так, 52 % не лічаць патрэбным падвяргаць Трампа імпічменту, у той час як 44 % выказваюцца на карысць адхілення яго ад пасады прэзідэнта. У жніўні падчас аналагічнага апытання 35 % выказваліся за імпічмент і 59 % выступалі супраць. Цяпер за імпічмент Трампа выказваюцца 77 % апытаных прыхільнікаў дэмакратычнай партыі (у жніўні такое меркаванне выказвалі 69 % дэмакратаў), 41 % выбаршчыкаў без пэўнай партыйнай прыналежнасці (у жніўні — 30 %) і толькі 9 % выбаршчыкаў-рэспубліканцаў.

«Так, колькасць людзей, якія выказваюцца ў падтрымку імпічменту, вырасла, аднак нязначна», — сказаў, каментуючы атрыманыя вынікі, кіраўнік даследчай службы Монмуцкага ўніверсітэта Патрык Мюрэй. У апытанні ўдзельнічаў 1161 чалавек.

Працэдура імпічменту была запушчана на глебе сцвярджэнняў аб тым, што Трамп у ліпеньскай тэлефоннай размове аказваў ціск на прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага з мэтай заахвоціць Кіеў ускосна дапамагчы кіраўніку вашынгтонскай адміністрацыі пераабрацца на другі тэрмін у 2020 годзе. Амерыканскі лідар нібыта дабіваўся пачатку расследавання дзейнасці сына былога амерыканскага віцэ-прэзідэнта Джозэфа Байдэна ва Украіне ў абмен на аказанне фінансавай і ваеннай дапамогі Вашынгтона Кіеву.

## Ва ўрадзе

### ДЗЯРЖАВА РОБІЦЬ СУР'ЁЗНЫЯ КРОКІ ПА ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ БІЗНЕСУ

**Аб гэтым заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва Аляксандр Турчын, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

На пасяджэнні Савета разглядалася прэзумпцыя добрасумленнасці як ключавы прынцып узаемадзеяння дзяржавы і бізнесу. Прапісаць у заканадаўстве кожную сітуацыю, кожны выпадак складана ці нават немагчыма, таму і важная праваправымяняльная практыка, заўважыў першы віцэ-прэм'ер. «Сёння паспяховае развіццё бізнесу — гэта рост нашай эканомікі. Як следства — павелічэнне і плацяжоў у бюджэт, і дабрабыту нашага народа», — адзначыў Аляксандр Турчын.

### РОСТ ЗАРОБКАЎ, НОВЫЯ ШКОЛЫ І МЕТОДЫКІ

**Віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка расказаў аб выкананні задач у адукацыі**

**Удасканаленне методык навучання, пераход на новыя навучальныя праграмы, будаўніцтва і мадэрнізацыя школ, падрыхтоўка педагагічных кадраў і дастойная заработная плата для настаўнікаў — выкананне ўсіх гэтых задач ідзе паэтапна і атрымлівае пазітыўныя водгукі. Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка пры наведванні Петкавіцкага вучэбна-педагагічнага комплексу яслі-сад—сярэдняя школа ў Дзяржынскім раёне, перадае БелТА.**

Важным аспектам ён назваў удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. «За апошнія 10 гадоў у краіне было пабудавана каля 50 школ, сёлета — сем. Яны абсталяваны па апошнім слове тэхнікі, каб вучань мог усебакова развівацца. Абсталяваны кабінеты фізікі, хіміі, біялогіі», — расказаў Ігар Петрышэнка. Для прыкладу: сёлета, у адпаведнасці з дзяржпраграмай «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016—2020 гады, установы агульнай сярэдняй адукацыі па ўсёй краіне атрымаюць 280 кабінетаў хіміі, 30 кабінетаў біялогіі, 1000 мультыбордаў. На набыццё абсталявання сёлета з рэспубліканскага бюджэту выдзелена 13,2 мільёна рублёў.

І, вядома, для павышэння прэстыжу прафесіі настаўніка значную ролю адыгрывае годная фінансавая ацэнка іх працы. «Мы выходзім на параметры, якія вызначыў кіраўнік дзяржавы, — дасягнуць узроўню 80 працэнтаў ад сярэдняй заработнай платы па краіне», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

# ПЕРСАНАЛЬНЫЯ АСІСТЭНТЫ, СІТУАЦЫЙНЫЯ ПАМОЧНІКІ І ІНШЫЯ ПАСЛУГІ...

## Дэпутаты працуюць над новым законам

**Законапраект аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі, які цяпер разглядаецца Палатай прадстаўнікоў, прадугледжвае важныя інавацыйныя падыходы. У прыватнасці, гаворка ідзе пра ўкараненне паслугі персанальнага асістэнта для людзей з інваліднасцю, аб сітуацыйнай дапамозе для інвалідаў ва ўсіх грамадскіх установах, квотаванні рабочых месцаў для іх і іншыя новаўвядзенні.**

«Будзе ўкараняцца паслуга персанальнага асістэнта для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — паведаміла журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Тамара КРАСОЎСКАЯ.** — На сённяшні дзень такія памочнікі для людзей з інваліднасцю ўжо маюцца, але яны звычайна прызначаны для дапамогі тым, хто перасоўваецца на інвалідным калясцы. З прыняццем закона плануецца, што гэтая паслуга будзе ўкараняцца для людзей з рознымі формамі інваліднасці». Тут маюцца на ўвазе перш за ўсё паслугі асабістага перакладчыка мовы жэстаў ці асістэнта для адзінокіх і адзінока пражываючых інвалідаў І і ІІ груп. Таксама паслуга суправаджэння будзе абавязкова ўводзіцца ў сем'і, у якіх ёсць людзі з інваліднасцю.

Па словах Тамары Красоўскай, пасля прыняцця закона людзі з інваліднасцю таксама змогуць атрымліваць сітуацыйную дапамогу ва ўсіх грамадскіх установах. Аказваць яе будуць спецыяльна навучаныя людзі. «Напрыклад, чалавек з інваліднасцю прыходзіць у краму. Яго сустракае гэты памочнік. Ён забяспечвае суправаджэнне, кансультуе, дапамагае, калі трэба, перамяшчацца», — расказала Тамара Красоўская.

Змены закрануць і сферу адукацыі, у якую будзе ўсё шырэй укараняцца інклюзіўнае навучанне. Для гэтага будуць спецыяльна абсталяваныя класы, індывідуальныя праграмы для дзяцей, якія маюць у гэтым патрэбу.

«Мы павінны зрабіць камфортнымі усе сферы жыцця для людзей з абмежаванымі магчымасцямі», — сказала Тамара Красоўская. Новы закон будзе накіраваны на гэта. Але вельмі важна, каб у нашым грамадстве таксама памянялася стаўленне да такіх асоб, каб мы ўспрымалі інвалідаў як звычайных людзей, якія жывуць побач з намі і проста часам маюць патрэбу ў дапамозе.

***

Пра ўсё гэта ішла гаворка на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў, прысвечаным укараненню інавацыйных формаў сацыяльнага абслугоўвання ў інтарэсах людзей з інваліднасцю. У ім, акрамя дэпутатаў, узялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.

Сам законапраект аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі паступіў у парламент 9 верасня. Ён быў разасланы ва ўсе пастаянныя камісіі Палаты прадстаўнікоў для разгляду, унясення прапаноў і карэкціровак. Да ўдзелу ў рабоце над законапраектам будуць прыцягнутыя і грамадскія аб'яднанні, у першую чаргу тыя, што прадстаўляюць інтарэсы людзей з інваліднасцю.

**Святлана БУСЬКО.**

# Беларускую моду паказалі ў Мілане

**Маладыя айчынныя дызайнеры прадставілі нашу краіну на міжнародным конкурсе European Fashion Union, які прайшоў у канцы верасня ў межах Міланскага тыдня моды і сабраў удзельнікаў з Беларусі, Венгрыі, Італіі, Казахстана, Кітая, Польшчы, Расіі, Украіны і Эстоніі.**

Пераможцы і прызёры Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота «Млын моды» Ірына Іскрыцкая, Ульяна Вараб'ёва і Маргарыта Калістратава паказалі свае калекцыі дзіцячага адзення, а дэфіле мадэляў з калекцыяй ад віцебскага мадэльера, майстра вясельнай моды Ганны Краснер завяршала першы конкурсны дзень EFU.




Акрамя таго, арганізацыйная і творчая каманда «Млына моды» наведала інстытут моды і дызайну Istituto Marangoni — адна з вядучых еўрапейскіх школ дызайну адзення, фатаграфіі і маркетынгу супрацоўнічае з беларусамі з 2013 года, дзякуючы чаму студэнты — маладыя дызайнеры з гэтай навучальнай установы могуць паказваць свае калекцыі ў Мінску, а выкладчыкі ўваходзяць у склад конкурснага журы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**Фота: Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.**

Напярэдадні свята

# «ІНКУБАТАР» ДЛЯ БУДУЧЫХ АЙЦІШНІКАЎ

## Рэсурсна-адукацыйны цэнтр плануецца стварыць у Жодзіне пры падтрымцы БДУІР

**Напярэдадні Дня настаўніка Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі і жодзінская сярэдняя школа № 8 заключылі партнёрскае пагадненне. Ініцыятарамі пілотнага праекта сталі патомныя педагогі — першы прарэктар БДУІР Сяргей ДЗІК і загадчык кафедры праектавання інфармацыйна-камп'ютарных сістэм Віталь ХАРОШКА. Для абодвух Жодзіна — малая радзіма.**



Трэба заўважыць, што летась пры падтрымцы БДУІР у 8-й жодзінскай школе ўжо быў адкрыты камп'ютарны клас з сучасным абсталяваннем, якое дазваляе навучацца ў тым ліку дыстанцыйна. Зараз жа супрацоўніцтва выйдзе на новы якасны ўзровень: школе будзе забяспечаны свабодны доступ да электронных адукацыйных рэсурсаў універсітэта, вучэбна-метадычных матэрыялаў, распрацаваных выкладчыкамі факультэта камп'ютарнага праектавання для факультатыўных заняткаў па асновах інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для школьнікаў.

«Мы зусім не выпадкова вырашылі даць старт праекту напярэдадні Дня настаўніка, — падкрэслівае Сяргей Дзік. — Хочацца, каб падпісанне партнёрскай дамовы стала для школы добрым падарункам да свята. Для мяне асабліва важна, што мерапрыемства праходзіць на маёй радзіме — гэта яшчэ і даніна памяці маім бацькам-педагогам».

Партнёрскі дагавор дазволіць перадаць школе самае каштоўнае — назапашаныя веды. Сучасныя электронныя навучальныя комплексы дапамогуць ісці ў нагу з часам і школьнікам, і іх педагогам. Для вучняў будуць праводзіцца сумесныя мерапрыемствы па прафарыентацыі і факультатыўныя заняткі. Настаўнікі змогуць павысіць сваю кваліфікацыю. Таксама для будучых абітурыентаў плануюцца экскурсіі ў БДУІР і іншыя сумесныя мерапрыемствы. Ужо ў кастрычніку школьнікі далучацца да акцыі «Стань студэнтам БДУІР на адзін дзень».

Сяргей Дзік адзначыў, што цяпер у моладзі ёсць практычна неабмежаваны доступ да інфармацыі, але ў гэтым патоку важна знайсці па-сапраўднаму патрэбнае і каштоўнае, каб зрабіць правільны выбар і вызначыць свой шлях у прафесіі.

На думку **дырэктара сярэдняй школы № 8 Жодзіна Віктара ХАРОШКІ,** для многіх гэты сумесны праект можа стаць лёсавызначальным. «ІТ-сфера выклікае цікавасць у многіх школьнікаў. Прыемна, што зараз любыя іх пачынанні, звязаныя з ІТ, будуць падтрымлівацца на прафесійным узроўні», — падкрэсліў ён.

У планах на найбліжэйшую будучыню — падключаць да навучання зацікаўленых хлопцаў і дзяўчат і з іншых жодзінскіх школ, каб на базе сумеснага класа БДУІР і СШ № 8 стварыць гарадскі рэсурсна-адукацыйны цэнтр па інфарматыцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота прэс-службы БДУІР.**

Абітурыент-2020

# ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА НА РТ АНЛАЙН...

**У кастрычніку ў краіне стартуе першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання (РТ). Пералік устаноў, дзе яно будзе праводзіцца па матэрыялах арганізатараў ЦТ, можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (РІКВ).**

Сёлета рэгістрацыя на рэпетыцыйнае тэсціраванне будзе ажыццяўляцца **ў анлайн-рэжыме праз адзіную сістэму рэгістрацыі ўдзельнікаў у асабістым кабінеце ўдзельніка тэсціравання на сайце РІКВ.** Як тлумачаць у інстытуце, гэта робіцца для зручнасці абітурыентаў, магчымасці аператыўна вырашаць пытанні, што ўзнікаюць у ходзе рэгістрацыі, і інфармавання абітурыентаў аб выніках рэпетыцыйнай спробы.

Каб зарэгістравацца для ўдзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні, абітурыент павінен зайсці ў свой асабісты кабінет на сайце www.rikc.by, выкарыстоўваючы ўкладку «РТ, on-line рэгістрацыя», увёўшы серыю і нумар дакумента, які сведчыць асобу, або пасведчання аб нараджэнні, і пароль.

Калі будучы абітурыент рэгіструецца для праходжання рэпетыцыйнага тэсціравання ўпершыню, ён павінен стварыць свой асабісты кабінет удзельніка рэпетыцыйнага тэсціравання на сайце РІКВ, выкарыстоўваючы ўкладку «РТ, on-line рэгістрацыя».

У асабістым кабінеце трэба зрабіць заяўку на ўдзел у першым раўндзе РТ, выбраўшы пункт яго правядзення, дату, час здачы экзамену, навучальны прадмет і мову прадстаўлення тэста (беларускую ці рускую).

Удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні аплачваецца з выкарыстаннем нумару асабовага рахунку, прысвоенага ўдзельніку ў момант стварэння асабістага кабінета на сайце РІКВ. Кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні складае сем рублёў за адзін прадмет. Аплаціць паслугу неабходна на працягу 24 гадзін з моманту фарміравання заяўкі на ўдзел у тэсціраванні, але не пазней часу заканчэння рэгістрацыі (дату і час заканчэння рэгістрацыі ўстанаўлівае пункт правядзення тэсціравання). Працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў РТ лічыцца завершаным толькі пасля здзяйснення аплаты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Як нас дураць

# У «ПАДАРУНАК» АД БАНКА — 100 РУБЛЁЎ НА КАРТУ...

**У гонар свайго дня нараджэння найбуйнейшы банк краіны дорыць кліентам грошы ў суме 100 рублёў. Такую інфармацыю паведамляюць адно аднаму ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі». У групавых чатах карыстальнікаў нібыта іх агульныя знаёмыя дзеляцца тым, што прынялі ўдзел у акцыі і сталі ўладальнікамі нечаканых дывідэндаў. Для гэтага неабходна толькі паведаміць рэквізіты банкаўскай карткі. У надзеі лёгка сарваць куш многія ідуць па інструкцыі і тут жа рэкламуюць акцыю сваякам, знаёмым, сябрам.**

Менавіта такім чынам пра падарунак ад банка даведалася і 61-гадовая жыхарка Маладзечна. У перапісцы са сваячкай жанчына паведаміла ёй 16-значны нумар і тэрмін дзеяння двух плацежных картаў, а таксама коды, якія прыходзяць на мабільны тэлефон. Аднак западозрыўшы падман, яна паспрабавала звязацца са сваячкай па тэлефоне. Трубку ніхто не падняў, а ў



адказ прыйшло паведамленне, што «абанентператэлефануе». У банку жанчыну «абрадавалі» тым, што адна з яе картаў была заблакаваная з-за падазроных аперацый, з другой жа БПК спісана 57 рублёў. Па факце крадзяжу грашовых сродкаў маладзечанка звярнулася ў міліцыю.

Дарэчы, самой сваячцы пашанцавала больш — зламыснікам з чата яна таксама паведаміла рэквізіты сваёй банкаўскай карты, праўда, грошай на ёй не было.

Як паведамляе **Група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Маладзечанскага РАУС,** практычна штодня ў райаддзел міліцыі сталі звяртацца жыхары рэгіёна. Усе яны пацярпелі ад ашуканскіх дзеянняў у сацыяльнай сетцы. У групавых чатах ад імя нібыта знаёмых ім прапаноўвалі атрымаць 100-рублёвы падарунак ад банка, калі яны паведамяць рэквізіты карты. Усе заяўнікі, як правіла, людзі старэйшага ўзросту. З-за сваёй залішняй даверлівасці гэтая катэгорыя грамадзян з'яўляецца вельмі ўразлівай. Цяпер па гэтых фактах праводзіцца праверка.

Як бачым, метад зламыснікаў у асноўным застаўся ранейшым, змяніліся месца лакацыі і падстава для падману. Калі раней ашуканцы «працавалі» з моладдзю ва «УКантакце», то цяпер «пераключыліся» на старэйшых грамадзян у «Аднакласніках». Таму, маючы зносіны ў сацыяльных сетках, раяць праваахоўнікі, пераканайцеся, што вы сапраўды перапісваецеся са знаёмым чалавекам, і што яго ўліковы запіс не ўзламаны. Інакш ад імя знаёмага вам чалавека будзе перапісвацца і абяцаць залатыя горы ашуканец. Ні ў якім разе нікому не паведамляйце канфідэнцыйныя звесткі. Толькі павышаная пільнасць і ўважлівасць дапаможа супрацьстаяць жулікам у інтэрнэце.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# УСЯГО 25, А ЎЖО З ГІСТОРЫЯЙ



## Карткі пакупніка. Жаночыя і мужчынскія

Экспазіцыя выстаўкі пачынаецца з 1990 года — часу станаўлення Нацыянальнага банка ў якасці эмісійнага цэнтра і фарміравання незалежнасці дзяржавы. Гэта быў перыяд крызісу, калі не хапала простых прадуктаў харчавання. Тады ўсеагульны дэфіцыт спрабавалі пераадолець шляхам выпуску купонаў і картак пакупніка.

У насельніцтва яны тут жа атрымалі назву «Талоны на харчаванне». У першую чаргу іх выдавалі на тавары першай неабходнасці. Талоны дазвалялі купіць у крамах невялікую колькасць мяса, крупы, гарэлкі, віна, алею, малака, смятаны. Таксама былі карткі на адзенне, мыла, лямпачкі і нават запалкі. Друкаваліся паперкі на айчыннай (не вельмі якаснай) паперы, на якую ставілася пячатка бухгалтэрыі прадпрыемства. Купоны выдаваліся па месцы работы, так што без афіцыйнага працаўладкавання тады жыць было цяжка. Пенсіянеры іх атрымлівалі праз мясцовыя выканкамы.

Такія карткі на тавары ў той час уводзіліся ва ўсіх былых рэспубліках Саюза, але толькі ў нас гэтыя дакументы мелі адрозненне па палавой прыналежнасці. Карткі былі і жаночыя, і мужчынскія.

Стваральнікі выстаўкі аднавілі прылавак постсавецкай крамы. Гэта пустыя малочныя шкляныя бутэлькі (палова літра і літр), механічныя шалі (якія яшчэ з гірамі), драўляныя лічыльнікі, а таксама «вечныя» пліткі шакаладу і згушчонка ў бляшаных слоічках. «Пры падрыхтоўцы да выстаўкі мы выявілі, што гэты перыяд не так моцна прадстаўлены прадметным шэрагам. Сабраць інсталяцыю крамы было вельмі цяжка, таму што некаторыя прадметы побыту захаваліся толькі ў адзінкавых экземплярах», — тлумачыць спецыяліст.

## Убачыць талеры

Далей ідзе 1992 год, калі пачынаўся працэс станаўлення нацыянальнай валюты. У гэты час кіраўніцтва краіны разглядала тры варыянты ўласных грошай. Тут мы можам убачыць выяву беларускага талера (была ідэя такіх грошай на



пачатку 90-х), экспазіцыя якога ўпершыню паказана грамадскасці, у тым ліку праект банкнот з выявамі гістарычных асоб.

У чым жа прынцыповае адрозненне нашага талера ад іншай нацыянальнай валюты? Па словах нашага гіда — **навуковага супрацоўніка Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці Міхаіла КАЧАНА,** існуе некалькі адрозненняў. Па-першае, гэта назва грошай. Слова «талеры» носіць больш гістарычнае адценне, таму што менавіта так называліся грашовыя знакі, якія хадзілі ў побыце на нашай тэрыторыі ў перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага, а таксама ў часы ўваходжання нашай краіны ў склад Рэчы Паспалітай.

Меркавалася, што талеры будуць мець разменны намінал — грошы. На новых грашах павінны былі адлюстроўвацца гістарычныя асобы. Распрацоўшчыкі прапанавалі змясціць на банкнотах выявы Льва Сапегі, братоў Луцкевічаў, Усяслава Чарадзея і княгіні Рагнеды, а таксама іншых славутых беларусаў.

Такі варыянт не быў абраны, бо ў той час у грамадстве не існавала адназначнага меркавання, хто сапраўды варты таго, каб яго змясцілі на купюру. У сувязі з гэтым былі выбраны больш нейтральныя варыянты дызайну — спачатку выявы жывёл, а пазней архітэктурных помнікаў.

«Таксама на талерах было іншае схематычнае выражэнне дзяржаўнасці. Ужо ў 1995 годзе ў нас у краіне памянялася дзяржаўная сімволіка. А на талерах засталася старая «Пагоня».

## Колас з Купалам — таксама не

Разглядаліся і варыянты беларускага рубля з выявамі знакавых асоб айчыннай гісторыі.

Другі няздзейснены варыянт уласных грошай больш падобны на сучасныя купюры, але таксама меў некалькі адрозненняў. Першае — гэта выява асоб бліжэйшай сучаснасці: Якуб Колас на купюры наміналам 10 рублёў, а на 50-рублёвай мог бы быць Максім Багдановіч. На іншых банкнотах —



Янка Купала і Францыск Скарына. Гэтыя грошы таксама павінны былі мець разменны намінал — грош: адзін рубель быў бы роўны 100 беларускім грошам. Аднак і гэты праект застаўся толькі на паперы. Ён не знайшоў належнай падтрымкі ні ў Вярхоўным Савеце, ні ў Нацбанку. Вярхоўны Савет прагаласаваў за «зайчыкаў».

## Усё цячэ, усё мяняецца

Тут жа побач на экспазіцыі размясціліся грошы 1992 года выпуску, тыя самыя так званыя тады «зайчыкі», а таксама «ваўкі», «рысі» і «зубры». Яны досыць хутка змянялі адно аднаго, а ўспамін пра іх выклікае ў пажылога пакалення толькі кіславатую ўсмешку. «Варыянт адлюстраваць жывёл, узятых, дарэчы, з энцыклапедыі «Жывёлы і птушкі Беларусі», быў зроблены як кампрамісны», — тлумачыць Міхаіл Качан. Гэтага кампрамісу, заўважыў супрацоўнік музея, у нашай краіне прытрымліваюцца і да цяперашняга часу.

Аддрукаваныя «зайчыкі» два гады мелі статус разліковага білета. Беларусь, як і іншыя маладыя незалежныя рэспублікі, спрабавала зразумець, як ёй выбудоўваць фінансавую і банкаўскую сістэмы — самастойна або ў саюзе з Расіяй. Але 19 кастрычніка 1994 года Вярхоўны Савет Беларусі прыняў пастанову, якой надзяліў разліковыя білеты Нацбанка правам называцца паўнавартаснай грашовай адзінкай.

Перажыўшы некалькі дэвальвацый і дэнамінацый, беларускія грошы за чвэрць стагоддзя ўжо некалькі разоў змянілі свой знешні выгляд. На змену жывёлам прыйшлі вядомыя будынкі і помнікі.

Далей ідзе экспазіцыя нашых наступных банкнот. Тут можна ўбачыць, як мяняліся наміналы нацыянальнай валюты пасля дэнамінацый 2000 і 2016 гадоў.

## Для душы і не толькі

Памятныя манеты ў нашай краіне пачалі выпускаць з 1996 года. На выстаўцы ёсць першая манета, выпушчаная ў тым годзе, — гэта манета, прысвечаная 50-годдзю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Манеты чаканіліся ў трох асноўных матэрыялах — у золаце, у серабры і ў медна-нікелевым сплаве.

Асобным блокам тут прадстаўлены працэс выпуску памятных манет. Гэта ўнікальныя прадметы: гіпсавыя ўзоры, рабочыя інструменты, малюнкі, эскізы манет.

Самым цікавым прадметам на выстаўцы з'яўляецца манета, адчаканеная да 900-годдзя Ефрасінні Полацкай. Тут прадстаўлены малюнак, які быў благаслаўлёны Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым экзархам усяе Беларусі Філарэтам. Тут жа знаходзіцца пластылінавы эскіз гэтай манеты і гіпсавыя мадэлі.

Паглядзець усе праекты грашовых знакаў, у тым ліку не выпушчаных, могуць усе ахвотныя з 1 кастрычніка да 21 снежня ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Неабходная папярэдняя рэгістрацыя. Паколькі выстаўка знаходзіцца на тэрыторыі рэжымнага аб'екта, з сабой неабходна ўзяць пашпарт (для непаўналетніх пасведчанне аб нараджэнні). Уваход платны: для дарослых — 5 рублёў, для студэнтаў — 3,5 рубля, для школьнікаў — 2,5 рубля. Паслугі гіда — 6 рублёў за гадзіну.

**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Надвор'е

# ВОСЬ І ПЕРШЫ СНЕГ...

**А ў нядзелю ўдзень будзе не больш за 10 цяпла**

**Мінулы тыдзень быў вільготны, але цёплы. Уплыў атмасфернага фронту захаваецца і ў пятніцу, будуць ісці кароткачасовыя дажджы, а максімальная тэмпература падымецца да плюс 15 градусаў. Але, на думку спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, у наступныя двое сутак чакаецца паступленне халодных няўстойлівых паветраных мас са Скандынаўскага паўвострава.**

5 кастрычніка будзе воблачна з праясненнямі. У асобных раёнах краіны захаваюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай слабы туман. Вецер паўночнай чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ўначы будзе апускацца да плюс 1 — плюс 7 градусаў, аднак месцамі чакаюцца слабыя замаразкі да мінус 2 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень ад плюс 5 градусаў па поўначы да 13 цяпла па поўдні краіны.

**Увага! Кардынальна зменіцца надвор'е ў нашай краіне ўжо ў нядзелю.** У гэты дзень будзе воблачна з праясненнямі. У асобных раёнах краіны абяцаюць кароткачасовыя апādкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер паўночнай чвэрці ўмераны. Уначы на большай частцы замаразкі ўжо да мінус 4 градусаў, але месцамі па паўднёвай палове краіны тэмпература паветра складзе ад плюс 1 градуса да плюс 5 градусаў. Не зусім камфортна чакаецца і ўдзень, калі максімальная тэмпература будзе падымацца не вышэй за 2—9 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Сугучча

# Творчасць яднае

**3—4 кастрычніка ў Магілёве працуе пленум Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы**

**Галоўная з тэм, якую вызначылі для размоў і дыскусій удзельнікі гэтай творчай сустрэчы, — 75-годдзе Вялікай Перамогі. Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы — творчая супольнасць, якая аб'яднала многіх беларускіх і расійскіх літаратараў. Гэтай грамадскай арганізацыі амаль дзесяць гадоў, яна заснаваная ў снежні 2009-га. У склад Саюза ўваходзяць Саюз пісьменнікаў Беларусі і Саюз пісьменнікаў Расіі.**

Расійскую дэлегацыю на пленуме ўзначальвае старшыня Саюза пісьменнікаў Расіі празаік, публіцыст Мікалай Іваноў, добра вядомы чытачу на постсавецкай прасторы як першаадкрывальнік «афганскай» тэмы. Як афіцэр-дэсантнік, Мікалай Іваноў на свае вочы бачыў вайну ў Афганістане. Як журналіст і пісьменнік прайшоў праз многія «гарачыя кропкі» ў постсавецкай гісторыі апошніх гадоў. Напісаў пра гэта цэлы шэраг цікавых кніг. У складзе расійскай дэлегацыі — літаратары, якім не чужая героіка-патрыятычная, ваенная тэма. Таму з асаблівай цікавасцю госці знаёміліся і з Буйніцкім полем пад Магілёвам, іншымі беларускімі адрасамі, звязанымі з тэмай Вялікай Айчыннай вайны.

З беларускага боку кіраўніком Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы з'яўляецца старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Аты-баты

# ПРЫЗЫЎНІКІ ВЕРНУЦЦА ДА ПРЫВАТНІКАЎ

**У студзені 2020 года набудуць моц ініцыяваныя Міністэрствам абароны змены ў Працоўным і Жыллёвым кодэксах Беларусі. Яны будуць датычыцца салдат, якія прайшлі праз тэрміновую службу і звольніліся ў запас. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе абароннага ведамства.**

Цяпер сітуацыя выглядае так. Калі хлопца прызываюць у армію, ён мусіць звольніцца са свайго месца работы. Але калі тэрмін службы заканчваецца, то ўзяць яго назад на тую ж або раўназначную пасаду абавязаны арганізацыі выключна дзяржаўнай формы ўласнасці. У іх рабочае месца за цяпер ужо былым салдатам захоўваецца на працягу трох месяцаў пасля даты звальнення ў запас. Цяпер жа гэтая норма пашырыцца і на прыватныя арганізацыі.

Акрамя таго, з 1 студзеня юнакі, якія адслужылі ў войску, атрымаюць першачарговае права на атрыманне месца ў інтэрнаце. Для гэтага трэба будзе падаць адпаведную рэкамендацыю з воінскай часці.

Міністэрства абароны нагадвае, што прапрацоўваецца яшчэ шэсць відаў прэферэнцый для тых, хто быў прызваны ў армію. Яны датычацца адукацыйнага і сацыяльнага кірунку. Сярод «бонусаў» — залічэнне тэрміну службы ў страхавы пенсійны стаж і час дзяржаўнай службы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**




## АДЗІНОЦТВА... ПЕЎНЯ

Так-так, ніякай памылкі: бываюць людзі, што жывуць адзінока, а бываюць, як высвятляецца, і хатнія птушкі.

...Гэтыя навасёлы (муж, жонка і дачушка гадоў пяці-шасці) у нашу вёску прыехалі са сталіцы. Казалі, што не з добрай волі, што былі на тое сур'ёзныя прычыны: у мужа — праблемы з алкаголем, з работай, з аплатай камунальных паслуг.

У нас жа гэта сям'я пасялілася ў невялікай старэнькай хатцы і, як быццам, стала да ўсяго прывыкаць. Праўда, не ў поўным складзе: гаспадар неўзлюбіў, падобна, вясковае жыццё і кудысьці з'ехаў. А вось жонка яго засталася, уладкавалася на ферму, сама купіла гусянят, потым нехта падарыў ім ягнятка... (Яго, дарэчы, вельмі палюбілі дзеці — хадзілі пагуляцца, а хто-ніхто і падражніцца... Што яно, відаць, і запомніла, бо, вырасшы ў магутнага барана з вялікімі пакручастымі рагамі, стала помсціць, прычым так, што жывёліну прыйшлося збыць.)

Курэй таксама гэта гаспадыня трымала.

І вось ранняй вясною ёй выдзелілі новае жыллё, і разам з дачкой яны сталі збіраць свае няхітрыя скарбы, каб перавезці на іншы падворак. Дайшла чарга да курэй. Гаспадыня палавіла іх, пасадзіла ў нейкую скрынку. Там жа заставалася месца для пеўня, але ён, як шаленец, насіўся па хлеўчыку, жанчына — за ім, і неяк здолася, што нават злавіла: схапіла яго за крылы і моцна трымала, але ж «па дарозе» ў скрынку ён рвануўся так, што толькі пер'е засталося ў руках ды крывавыя пісягі ад кіпцюроў... Сам жа Пеця куляй паляцеў у канец агарода. «Ну і не буду я бегаць за табой, — пакрыўдзілася жанчына. — Задзірай цябе каршун!»

А певень і не думаў спалохацца: застаўся на старой сялібе, жыве сваім жыццём. Кожны дзень важна выходзіць з падворка, уважліва азірае «ўладанні» і пры гэтым — не дурань — на дарогу не ідзе, быццам разумее, што дабром гэта можа не скончыцца: машын у цэнтры гойсае шмат.

...Вось так і жыве адшчапенцам: знаходзіць сабе нейкую ежу і ваду, раніцай будзіць наваколле, ходзіць пад вокнамі. Але ж гэта летам ды ў пачатку восені. Што ён «запяе» потым, калі выпадзе снег?

Пажывём — пабачым.

**Ніна Бурко,** *Бярэзінскі раён.*

## КАБ НЕ ТОЙ ШАКАЛАДНЫ ПУНШ

Было гэта ў 60-я гады мінулага стагоддзя ў слаўным горадзе Кіеве. У мяне там жыў дзядзька. Сваіх дзяцей яны з цёткай не мелі, таму заўсёды з радасцю чакалі ў госці мяне. І ўжо разам мы каталіся па Дняпры на рачным трамваі, хадзілі ў музеі, у заапарк, у цырк...

Так магло атрымацца і ў чарговы прыезд, калі б дзядзька не вырашыў пазнаёміць мяне з сынам свайго саслужыўца.

Яша, як той казаў, вышаў і ростам і прыгоствам, а да таго ж — нейкай нечаканай для мяне дзелавой хваткай. Хвілін праз дзесяць пасля знаёмства ён ужо спланаваў: перш-наперш мы наведаем ВДНГ (выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі), потым — канцэрт Аркадзя Райкіна (ён якраз прыязджаў на гастролі), потым — сходзім на оперу... Такім чынам кожны дзень майго гасцявання атрымаўся «распісаным»...

І вось ён першы. Мы вясёлыя і шчаслівыя гуляем па ВДНГ, размаўляем, нешта абмяркоўваем, дзівімся, пераходзім з аднаго павільёна ў другі, прычым — па цудоўных алеях, абсаджаных пладовымі дрэвамі.

Мяне, помню, найбольш уразілі ігрушы. На зямлі, пад дрэвамі іх не было — ніводнай, а вось над галавой — процьма... І ўсе вялікія, спелыя... Праўда, іх чамусьці ніхто не зрываў і не еў, хоць з'есці, вядома ж, хацелася.

— Сходзім у рэстаран? — прапанаваў Яша.

— Сходзім! — кажу.

І вось мы ўжо там — сядзім на другім паверсе, на адкрытай тэрасе, чытаем меню. Большасці страў я проста не ведаю, аднак з разумным тварам выбіраю нейкую рыбу і катлету па-кіеўску.

— А выпіць што? Каньяк? Віно? — пытае мой спадарожнік.

— Не, ты што?! Я не п'ю... Зусім!

— Тады, можа, пунш? Ён смачны, салодкі...

— Ну давай... Пакаштую.

Афіцыянт усё запісаў і праз нейкі час пачалося: на стале з'явілася бутэлька з надпісам «Шакаладны пунш» і графінчык з каньяком для Яшы. Следам (закускі мы не заказвалі) прынеслі два блюды з гарачым. На маім — была чамусьці цэлая вялізная рыбіна, а на Яшавым — адбіўная з гарнірам. Мы пакрысе выпілі, мой спадарожнік стаў есці, а я разгубілася, бо пад рукі, апроч відэльцаў, паклалі нейкія кручкі. Я здагадвалася, што імі трэба разбіраць рыбу. Але як? Не ведаю — значыць, не ем (Яшу сказала, што рыбы расхацелася), і гэта блюда забралі. Прынеслі іншае — з катлетай. Думаецe, з ёю было прасцей? Нічога падобнага! Рэч у тым, што з катлеты тырчала нейкая доўгая костка. «Гэта для таго, каб есці рукой», — вырашыла я. А пацягнулася ўзяць і тут жа перадумала: раптам трэба відэльцам?

Такім чынам мне «расхацелася» і катлеты: ела толькі гарнір — бульбяное пюрэ.

А вось з пуншам усё было зразумела! Па-першае, смаката — невыказная, шакаладам пахне, душу весяліць... І замарочак ніякіх: налівай ды пі.

Спачатку наліваў афіцыянт, потым Яша, а калі ён не заўважаў пусцеючага фужэра, я магла і сама... Ну што тут такога, як мне здавалася, хоць Яша і «слупянеў» — спачатку...

З рэстарана мы выйшлі вясёлыя. Зноў ішлі па знаёмых дарожках, абсаджаных пладовымі дрэвамі, зноў глядзелі на ларкі, дзе прадаваліся ігрушы.

— Дзіўныя людзі! Навошта ж іх купляць? Вунь колькі расце, — казала я і... рвала ігрушы, давала свайму спадарожніку... Ён чамусьці чырванеў, але браў.

Мне ж ігруш зусім не хацелася, а вось пайсці да Дняпра і там пакупацца...

Яша гэту ідэю не падтрымаў. Сказаў:

— Мы паедзем да цябе, да твайго дзядзькі.

Ну і далей: я, маўляў, вінаваты — сапсаваў нам гэтакі дзень...

— Ды з чаго ты ўзяў? У чым вінаваты? Чаму сапсаваў? — не разумела я. — Мы пабылі на цудоўнай выставе, ты звадзіў мяне ў рэстаран, а зараз яшчэ і на рэчку...

Аднак Яша нічога не слухаў — ён стаяў на сваім, а дакладней — вёў мяне да стаянкі таксі, адкуль нас мігам прывезлі на кватэру да дзядзькі.

— Божухна, дзе ж ты так напілася?! — не верачы вачам, спытала ягоная жонка.

— Я?! Цётачка, ды вы што — не ведаеце? Я алкаголю не п'ю — зусім. Хіба — шакаладны пунш...

— Дык гэта ж дарагі алкагольны напой, — сказала яна. — Яго вараць з рому!

...Такім чынам не суджана было спраўдзіцца Яшавым грандыёзным планам, бо назаўтра ж я з'ехала з Кіева дамоў і з гэтым хлопцам (вельмі сорамна было) ніколі больш не сустракалася...

Хоць і шкада. Цікавы быў чалавек. І калі б не той пунш...

Хто ведае, можа, зусім па-іншаму склаліся б нашы жыцці.

Дарэчы, потым, ужо дарослай, той пунш я піла, але толькі крыху. Больш — пабаялася, каб потым зноў не палезці па ігрушы — у суседаў сад.

**Зоя Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

## БОРШЧ НЕ РАЗЛІВАЕЦЦА...

У народзе кажуць, што адзін дасужы, ды не дужы, што адным пальцам вузла не завяжаш і адна пчала мёду не наносіць, што — і зноў жа — адна галавешка ў печы не гарыць, а дзве — і ў полі не тухнуць...

Правільна кажуць: нельга чалавеку жыць аднаму, дай бог з маладосці знайсці сабе годную пару, стварыць добрую сям'ю.

Лёгка сказаць, а вось як зрабіць...

Раскажу пра сябе.

Некалі даўно я жыла ў рабочым інтэрнаце і дагэтуль помню, як аднойчы да маёй суседкі па ложку завітаў брат, прычым не адзін, а з сябрам, якога мы тады ўбачылі ўпершыню. Загадкавы быў хлопец: да чарнаты загарэлы, вельмі сур'ёзны, занураны ў сябе...

Высветлілася, што служыў ён у так званай гарачай кропцы, што ў свае гады вельмі шмат чаго перажыў і тым самым яшчэ больш распаліў дзявочую цікавасць, а вось сам...

Ну хоць бы паглядзеў на нейкую з нас, хоць бы раз усміхнуўся... Нуль увагі — ні больш, ні менш!

«Ах так, — падумала я, — не ідзе гара да Магамета. Тады ён пойдзе да гары». (А што рабіць, калі запаў мне ў сэрца?)

І стала я прыбірацца ва ўсё найлепшае, пры макіяжы, у поўнай баявой расфарбоўцы нават смецце выносіць: а раптам сустрэнецца?

Неяк зімою, помню, пашчасціла: убачыла, што Лёша (так звалі хлапца) па вузкай сцежцы пайшоў на аўтобусны прыпынак. Я штосілы пабегла следам. Абагнала яго, але ж павіталася — паказалася яму, хоць і снегу набрала поўныя боты...

Наступны крок да хлапечага сэрца прапанавала перасмешніца Люба. У заводскай сталоўцы, куды прыходзіў Алёша, яна працавала кухаркай. «А ты можаш пастаяць на раздачы, — прапанавала яна. — У начную змену, калі начальства не бачыць».

Я, вядома ж, згадзілася: ну чаму б і не? Прыбралася ва ўсё белае — халат, каўпак — стала перад шумлівай чаргой. Думала, ну што там складанага — нейкага баршчу наліць ды катлету да гарніру пакласці... Аказалася, не: рукі ў мяне дрыжалі ад хвалявання, боршч разліваўся, металічныя міскі і шклянкі (добра, калі папрасяць кампот, а не чай) да касцей «прапякалі» пальцы, чарпак ледзь варочаўся ў гіганцкай каструлі, пáра з яе сцінала дыханне...

А людзі ў чарзе галодныя. Яны стаяць — чакаюць. І не маўчком. Чую: «Глянь, новенькая... Мабыць, нейкая практыкантка? Смешна працуе».

І чым далей, тым «смяшней», бо на гарызонце мільгануў такі знаёмы загарэлы твар Аляксея, пасля чаго ўсе катлеты ну як згаварыліся: і адна, і другая, і трэцяя сталі проста развальвацца пад маім відэльцам — ні накалоць, ні пакласці...

Але ж гэта ўсё драбяза, бо мы з ім зноў павіталіся. А неяк ён мяне сустрэў.

— Чым бліжэй да кухні, тым цяплей, — сказаў ён і першы раз усміхнуўся. — З гладу ніводзін кухар яшчэ не памёр. Так што ўсё правільна. Хоць — ты ведаеш — усё трэба рабіць умеючы...

Ды было б жаданне: пасля доўгачаканага вяселля я вельмі хутка асвоіла кулінарныя хітрыкі, спрытна ўпраўлялася ў цеснай куханьцы нашай маласямейкі: чым магла, радавала Лёшу і нашага сына, прымала гасцей. Боршч болей не разліваўся, катлеты — не развальваліся.

**Таццяна Р.,** *г. Наваполацк.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў

# Слёзы каштанаў



Пра дробязі, якія робяць жыццё цікавейшым, восень — цяплейшай, а думкі — філасофскімі (што восенню якраз дарэчы)

У Мінску гэтым часам сапраўдная мода на каштаны. Пэўна, гэта такі сталічны трэнд, бо больш падобнага нідзе не назіраецца. Была днямі ў Койданаве, дык там бліскучыя карычневыя шарыкі ляжаць проста ў кучах, згрэбеных дворнікамі, разам з пасохлым лісцем ды сівой травой, і ніхто на іх не квапіцца. І ў Полацку на бульвары, што вядзе да помніка Скарыну, безліч каштанаў валяецца ў гэтую пару года, і яны сакавіта хрусцяць пад нагамі мінакоў, бо абысці ўсё гэта багацце, не наступіўшы, даволі праблематычна... У Мінску ж пад шматлікімі дрэвамі ляжаць у траве толькі калючыя шалупайкі, а саміх каштанаў не знайсці. Хто іх збірае — застаецца толькі здагадвацца. Можа, дзеці для якога рукадзелля ў школе. А можа, і дарослыя, якія ходзяць, топчуць мокрае жоўтае лісце на асфальце, углядаюцца пад ногі, нібы згубілі штосьці важнае і цяпер, менавіта восенню, стараюцца яго знайсці.

Я, напрыклад, не мінаю ніводнага каштанавага дрэва, што трапляецца на шляху, абавязкова зазірну пад яго: а раптам? Здараецца, шанцуе, і тады набіваеш гладкімі амаль бескарыснымі пладамі кішэні паліто. Пасля ідзеш, перабіраеш іх і проста адчуваеш, як спакайнееш, лагаднееш, сам сабе ўсміхаешся... Апошнім часам на гарадскія каштаны ўбілася зараза, якая завецца каштанавая моль і якой пакуль не могуць даць рады. З-за яе дрэвы з прыгожымі пушыстымі кронамі стаяць іржава-рудыя ўжо ў ліпені, а да пачатку кастрычніка і губляюць амаль усё сваё пакарабачанае і пакручанае лісце. І калі пад ветрам і дажджом з гэтых голых няшчасных дрэў пачынаюць сыпацца зялёныя «яблыкі» з тоўстымі калючкамі і разбівацца аб зямлю, здаецца, з іх пстрыкаюць буйныя слёзы. Можа, таму і цягне іх пазбіраць, каб пакінуць на памяць, бо не ўпэўнены, што скалечаныя дрэвы налета закрасуюць і выгадуюць плады?

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні асабліва важна праявіць разважлівасць і ўпартасць у дасягненні пастаўленых задач. Неабдуманых учынкаў быць не павінна, іх наступствы могуць не толькі ўскладніць жыццё, але крута змяніць лёс. Падзеі прыспешваць не варта, аднак пускаць на самацёк тым больш нельга. У пятніцу зможаце вырашыць самыя вострыя і надзённыя праблемы. У выхадныя дні вас могуць выбіць з каляіны нечаканыя падзеі ў сямейным жыцці.

**РЫБЫ.** Неабходна засяродзіцца на самым важным у цяперашні момант, а не распыляцца на дробнае і непатрэбнае. У аўторак давядзецца адстойваць свае інтарэсы ў адносінах з партнёрамі. Рэальна разлічвайце сілы, паспрабуйце на рабоце вырашаць толькі тыя праблемы, якія залежаць ад вас. Чацвер — добры дзень для рэалізацыі творчых планаў.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.16 | 18.39 | 11.23 |
| Віцебск — | 7.07 | 18.28 | 11.21 |
| Магілёў — | 7.06 | 18.30 | 11.24 |
| Гомель — | 7.02 | 18.27 | 11.25 |
| Гродна — | 7.31 | 18.55 | 11.24 |
| Брэст — | 7.31 | 18.57 | 11.26 |

### Месяц

*Маладзік 28 верасня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

**Пр.** *Алега, Аляксандра, Міхаіла, Фёдара.*
**К.** *Тэрэзы, Юзафа, Яна.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 4 КАСТРЫЧНІКА

**У краіне**

**1744** год — нарадзіўся (горад Камянец) Міхал Францішак Карповіч, палітычны і царкоўны дзеяч, багаслоў-асветнік. Адукацыю атрымаў у Брэсцкім езуіцкім калегіуме. З 1771 года выкладаў тэалогію ў Кракаве, затым — багаслоўе і царкоўную гісторыю ў епархіяльнай семінарыі пры касцёле святога Казіміра ў Вільні. Займаўся таксама прапаведніцкай дзейнасцю, пісаў вершы з нагоды розных падзей жыцця мясцовых магнатаў, прапагандаваў ідэі французскіх асветнікаў. Адзін з першых у Беларусі пачаў крытыкаваць прыгоннае права і жорсткае абыходжанне феадалаў з сялянамі. Сабраў багатую бібліятэку. Падчас паўстання 1794 года ўваходзіў у склад паўстанцкага ўрада. Памёр у 1803 годзе.

**1800** год — нарадзіўся Іван Іванавіч Гарбачэўскі, рэвалюцыянер-дзекабрыст. Дзяцінства і юнацтва прайшлі ў Віцебску. Скончыў Віцебскую гімназію, затым выхоўваўся ў Дваранскім палку (афіцэрскай школе пры 2-м кадэцкім корпусе) у Пецярбургу. З 1820 года ў чыне прапаршчыка служыў у 8-й артылерыйскай брыгадзе ва Украіне. Вёў прапаганду і агітацыю сярод салдат і афіцэраў, быў прыхільнікам знішчэння царскай сям'і. Падчас паўстання Чарнігаўскага пяхотнага палка (1825 г.) спрабаваў падняць суседнія воінскія часці. У студзені 1826-га арыштаваны і асуджаны да смяротнага пакарання, якое было заменена катаргай. У ссылцы вёў рэвалюцыйную прапаганду сярод мясцовага насельніцтва, зблізіўся са ссыльнымі рабочымі, знаёміў іх з выданнямі А. І. Герцэна — «Полярной звездой» і «Колоколом». Пасля катаргі жыў на пасяленні ў Чыцінскай вобласці. Аўтар мемуараў, прысвечаных руху дзекабрыстаў. Памёр у 1869 годзе.

**1940** год — нарадзіўся (Мінск) Анатоль Іванавіч Алай, беларускі рэжысёр, аператар, сцэнарыст дакументальнага кіно, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Сярод аператарскіх работ фільмы «Хроніка знаходжання на Зямлі», «Фільм даўжынёй у паўстагоддзя», «Дзевяноста шостая восень» і іншыя. Рэжысёр фільмаў «Не плачце па мне...», «Чорная дарога», «Чарнобыльскі крыж». Лаўрэат прызоў міжнародных кінафестываляў. Аўтар кнігі «Сустрэчы на ўсё жыццё: запіскі кінааператара».



**У свеце**

*Дзень пачатку касмічнай эры чалавецтва, абвешчаны Міжнароднай федэрацыяй астранаўтыкі ў верасні 1967 года. 4 кастрычніка 1957 года ў СССР з касмадрома Байканур быў выведзены на арбіту першы ў гісторыі планеты штучны спадарожнік Зямлі.*

**1895** год — нарадзіўся Рыхард Зорге, савецкі разведчык, Герой Савецкага Саюза (1964, пасмяротна). Удзельнік Першай сусветнай вайны, служыў у германскай арміі. З 1924 года — у СССР, з 1929-га — у разведорганах Чырвонай Арміі. У 1930—40-х гадах у якасці нямецкага журналіста працаваў у Германіі, Кітаі, Японіі. У Токіа стварыў разведгрупу «Рамзан», якая здабывала важную для СССР інфармацыю. Адзін з першых паведаміў дату (20—22 чэрвеня) нападу фашысцкай Германіі на СССР, колькасць нямецкіх дывізій і агульную схему іх плана ваенных дзеянняў, а ў кастрычніку 1941-га — пра негатоўнасць Японіі да нападу на СССР. У кастрычніку 1941 года быў арыштаваны японскай паліцыяй і ў верасні 1943-га асуджаны да смерці. Павешаны 7 лістапада 1944 года, пахаваны ў Токіа.

## УСМІХНЕМСЯ

На вяселлі. Сведкі па традыцыі пайшлі збіраць дровы з гасцей — «на хлопчыка, на дзяўчынку»: на каго больш набяруць, той першы ў маладых народзіцца.

Вельмі п'яны госць:

— Дык мы на дзяўчынку ўжо скідваліся.

Жаніху перад хлапечнікам.

**Назіраю ў сябе пяршэнне ў горле, насмарк, кашаль і іншыя падставы палячыцца каньячком.**

— Колькі ў нас тавару на складзе?

— Не ведаю.

— Ну прыкладна?

— Ды сказаў жа: не ведаю!

— Ну хоць груба скажы!

— Ды чорт яго ведае!

**Калі пакарання без віны не бывае, то чым мы вінаватыя, што існуюць песні Стаса Міхайлава?..**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3514.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# Мясцовае самакіраванне

4 кастрычніка 2019 г. № 40 (525)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# ЯК СЭКАНОМІЦЬ ХАЛАДАМІ?



**Камунальнікі падказваюць: праз новыя трубы, прыборы ўліку цяпла і індывідуальныя градусы**

Фота БелТА.

**Штогод колькасць гігакалорый, затрачаных на ацяпленне нашых дамоў, змяншаецца. За кошт мадэрнізацыі цепласетак і ўцяплення фасадаў лічыць захаваныя адзінкі цяпла можна ўжо мільёнамі. Памер «зімовай камуналкі» пры гэтым, праўда, не меншае, але ж затое расце не так хутка, як мог бы, калі б цеплаcтраты на шляху ад крыніцы энергіі да жылля былі большыя. Акрамя таго, можна атрымаць 5- або 10-працэнтную зніжку, разлічваючыся за цяпло індывідуальна.**

## 15 тысяч «цёплых» кіламетраў

Работа па аднаўленні трас, па якіх у нашы дамы прыходзіць цяпло, актыўна вядзецца з 2000-х. А ўжо з 2004-га ў краіне не менш за 4 % старых цепласетак штогод стабільна замяняюцца новымі, а гэта як мінімум 600 кіламетраў, сёлета ж увогуле адновяць 649 кіламетраў. А ўсяго на балансе ЖКГ 15 тысяч кіламетраў цеплавых магістраляў, 67 % з якіх — гэта сучасныя ПІ-трубы.

— *На сучасных перадізаляваных трубах прадугледжана сістэма аператыўнага дыстанцыйнага кантролю (САДК), якая дазваляе пастаянна сачыць за станам цеплаізаляцыйнага слою цягам усяго «жыцця» трубы — 25 гадоў,* — расказала **Святлана ЦІМОШКІНА, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ.** — *Лічба ў 4 %, дарэчы, і разлічана зыходзячы з гэтага тэрміну, бо намінальна праз 25 гадоў новыя камунікацыі неабходна будзе мяняць, каб не надышоў звышнарматыўны тэрмін эксплуатацыі. Праўда, цяпер гэты час, пэўна, можна і перагледзець, таму што камунікацыі служаць значна даўжэй, а некаторыя вытворцы заяўляюць час службы трубы і ў 50 гадоў. Аднак рабіць гэта, каб мяняць штогод, скажам, толькі 2 % цеплатрас ад агульнай іх колькасці, мусіць, лепш, калі ў нас ужо 100 % цеплавых магістраляў будуць з ПІ-труб.*

стар. 4

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

# У мясцовых бюджэтах з'явяцца дадатковыя магчымасці

**Імі важна скарыстацца для росту валавога рэгіянальнага прадукту і стварэння новых працоўных месцаў**

**У Мінску распачала сваю работу сёмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу шостага склікання. Усяго на парадку дня сесіі больш за 40 законапраектаў. Яны датычыліся эканомікі, сацыяльнай сферы, знешняй і ўнутранай палітыкі нашай краіны — у тым ліку і рэгіянальнай.**

Сесія пачалася з даклада старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча «Бягучыя і перспектыўныя задачы развіцця». Сярод важных і першачарговых пытанняў ён агучыў пэўныя меры і прапановы па далейшым актыўным развіцці рэгіёнаў. Возьмем законапраекты так званага «бюджэтнага пакета», якія ўтрымліваюць новыя падыходы да фінансавання патрэб раёнаў. Цяпер паказчыкі мясцовых бюджэтаў па даходах на 2020 год разлічаны з захаваннем дзеючых нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў і збораў у бюджэты абласцей.

стар. 2


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### На шляху да Мэт



Чаго чакаюць арганізатары ад правядзення конкурсу ў галіне ўстойлівага развіцця? стар. 2

### Хто будзе сенатарам?



Свае кандыдатуры на вылучэнне ў Савет Рэспублікі ўжо прапанавалі сталіца і Брэстчына. стар. 2

### Прагаласаваць за мяжой



У выбарах возьмуць удзел і беларусы, якія часова знаходзяцца ў Расіі. стар. 3

### Уласная нерухомасць



Што трэба ведаць аб правядзенні капрамонту: калі яго робяць і за чый кошт? стар. 4, 13

### Дапамогуць дэпутаты



Як у Магілёве насельніцтва разам з народнымі абраннікамі робіць утульнымі свае двары. стар. 14

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# На шляху да агульных мэт

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА сустрэлася на мінулым тыдні з выканаўчым дырэктарам Дортмундскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра, кіраўніком Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага Урада Германіі Астрыд ЗАМ.**


sovrep.gov.by

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, падчас сустрэчы бакі абмеркавалі пытанні супрацоўніцтва і перспектывы рэалізацыі новых сумесных праектаў у межах конкурсу ў галіне ўстойлівага развіцця.

Ён, дарэчы, будзе праводзіцца па чатырох тэматычных блоках: інклюзіўным і раўнапраўным грамадстве; «зялёным» пераходзе і лічбавай трансфармацыі; лакалізацыі МУР; развіцці сістэм маніторынгу і ацэнкі эфектаў у кантэксце рэалізацыі Парадку-2030.

«Добра было б, калі б такія праекты запусцілі і на базе 11 гарадоў паскоранага развіцця, якім у нашай краіне ўдзяляецца асаблівая ўвага», — прапанавала Мар'яна Шчоткіна.

Яна пацікавілася, як развіваюцца рэгіянальныя сувязі паміж Беларуссю і Германіяй і якія сферы для абедзвюх краін маюць найбольшую цікавасць. Акрамя таго, Нацыянальны каардынатар нагадала, што ў Магілёўскай вобласці рыхтуецца рэгіянальная стратэгія ўстойлівага развіцця. Гэта добрая пляцоўка для супрацоўніцтва з нямецкімі партнёрамі, якая ў далейшым можа стаць прыкладам і для іншых рэгіёнаў.

Як удакладніла Астрыд Зам, конкурс дазволіць сабраць і прааналізаваць розныя прапановы і ініцыятывы ў галіне ўстойлівага развіцця. Цікавыя тэмы ўжо ёсць. Напрыклад, Магілёў і Бон звязвае тэматыка скарачэння выкідаў парніковых газаў. Нямецкія партнёры вывучаюць магчымасці выканання праектаў у сферы энергаэфектыўнасці ў Брэсцкай вобласці.

Астрыд Зам таксама заявіла пра цікавасць экспертнай супольнасці Нямеччыны да ўдзелу ў Форуме па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў рэгіёне ЕАЭС, які Мінск плануе прыняць у 2020 годзе. «Гэта добрая магчымасць абмеркаваць наша супрацоўніцтва, у тым ліку канкрэтныя праекты ў галіне ўстойлівага развіцця», — падкрэсліла яна.

Падчас сустрэчы таксама абмяркоўваліся пытанні арганізацыі ў 2020 годзе ў нашай краіне Тыдня ўстойлівага развіцця.

# У мясцовых дадатковыя

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Важная акалічнасць, на якую звярнуў увагу спікер верхняй палаты парламента: плануецца захаваць аб'ёмы датацый, якія перадаюцца абласцям, на ўзроўні, не ніжэйшым, чым у бягучым годзе, незалежна ад планаванага паступлення ўласных даходаў. Савету Рэспублікі як палаце тэрытарыяльнага прадстаўніцтва мэтазгодна падтрымаць такія падыходы ўрада і Міністэрства фінансаў пры разглядзе законапраекта аб рэспубліканскім бюджэце на 2020 год, упэўнены старшыня Савета. Ён выказаў надзею на тое, што на месцах скарыстаюцца гэтымі дадатковымі магчымасцямі для росту валавога рэгіянальнага прадукту і стварэння новых працоўных месцаў. Прадугледжваюцца і іншыя меры заахвочвання больш актыўнага развіцця рэгіёнаў.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Савет Рэспублікі і Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, што функцыянуе пры ім, шукаюць новыя кірункі рэгіянальнага развіцця. На яго погляд, гэтыя пытанні актуальныя не толькі ў перыяд выбарчых кампаній. Так, напрыклад, у верасні бягучага года ў Бялыніцкім раёне былі дэталёва разгледжаны пытанні ўдасканалення работы з сельскім насельніцтвам. Акрамя таго, вызначаны



ВЫБАРЫ-2019

# ХТО СТАНЕ СЕНАТАРАМ?

## Склад прадстаўнікоў Мінска ў Савеце Рэспублікі амаль цалкам абновіцца

**Кандыдатуры прэтэндэнтаў на вылучэнне ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу ад Мінска былі разгледжаны на сумесным пасяджэнні Мінгарвыканкама і Мінгарсавета. Дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо — адзіны з сенатараў мінулага склікання, хто зноў будзе прадстаўляць сталіцу ў верхняй палаце парламента, паведамілі БелТА ў прэс-службе Мінгарвыканкама.**

З дзевяці разгледжаных на пасяджэнні кандыдатур у склад Савета Рэспублікі ад Мінска адабраны восем. Акрамя Алега Румо ў іх лік увайшлі дырэктар РНПЦ дзіцячай хірургіі Канстанцін Драздоўскі, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй Іванец, дырэктар гімназіі № 10 Марына Ільіна, начальнік галоўнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў па Мінску Таццяна Рунец, загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін БДУ Андрэй Русаковіч, намеснік дырэктара — кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі Сяргей Сівец, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктар Чайчыц.

У 2016 годзе членамі верхняй палаты парламента ад Мінска сярод іншых сталі цяперашнія старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна Шчоткіна, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда.

Нагадаем, што выбары ў Савет Рэспублікі пройдуць 7 лістапада. Сенатараў выбіраюць мясцовыя Саветы дэпутатаў. Усяго вылучаюцца восем кандыдатаў ад кожнай вобласці і восем ад Мінска. Прэзідэнт Беларусі прызначае яшчэ восем сенатараў.

* * *

**Брэсцкая вобласць вызначылася з кандыдатамі ў члены Савета Рэспублікі. Пра гэта БелТА паведамілі ў галоўным упраўленні арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама.**

Абмеркаванне кандыдатур прэтэндэнтаў у верхнюю палату парламента адбывалася на сумесных пасяджэннях прэзідыумаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і выканаўчых камітэтаў. Усяго вылучана восем кандыдатур. Сярэдні ўзрост кандыдатаў у сенатары складае 56 гадоў. Самы вопытны з іх — дырэктар ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Баранавіцкага раёна Васіль Маркевіч, які цяпер з'яўляецца дзеючым членам Савета Рэспублікі.

Адным з самых вядомых у спісе прэтэндэнтаў можна назваць галоўнага ўрача Брэсцкай абласной бальніцы доктара медыцынскіх навук, прафесара Аляксандра Карпіцкага, які чатыры склікання абіраўся дэпутатам абласнога Савета. За яго кандыдатуру аднагалосна прагаласавалі ў Брэсце і Камянцы. Павагу і аўтарытэт дзякуючы шматгадовай добрасумленнай працы здабыў у земляко ў і старшыня Столінскага райвыканкама Рыгор Пратасавіцкі, кандыдатуру якога прапанавалі ў Століне і Лунінцы.

Бярозаўскі і Пружанскі раёны ў верхняй палаце парламента можа прадставіць старшыня абласнога Савета дэпутатаў Юрый Наркевіч, Кобрынскі і Маларыцкі — старшыня абласной калегіі адвакатаў Тамара Шатлікава. У спіс удзельнікаў кампаніі таксама ўвайшлі старшыня Жабінкаўскага райсавета Анатоль Шалтанюк, дырэктар ААТ «Парахонск» Валерый Храленка, загадчыца натарыяльнай канторы Пінска Ірына Сачкоўская.

* * *

**Магілёўская вобласць прапанавала свае кандыдатуры ў члены Савета Рэспублікі. Інфармацыя аб гэтым размешчана на сайце ЦВК. У спісе прозвішчы васьмі чалавек.**

Прэзідыумамі Быхаўскага, Касцюковіцкага і Краснапольскага райсаветаў дэпутатаў прапанаваная кандыдатура Віктара Ананіча, старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк», Бабруйскі гарадскі, Слаўгарадскі і Асіповіцкі раённыя Саветы дэпутатаў вылучылі кандыдатуру Сяргея Анюхоўскага, дырэктара ААТ «Чырвоны харчавік». Магілёўскі гарадскі Савет дэпутатаў абраў у якасці свайго кандыдата Дзмітрыя Варанюка, першага сакратара ЦК грамадскага аб'яднання БРСМ, а Магілёўскі і Чавускі раённыя Саветы — Алега Дзячэнку, прарэктара па вучэбнай рабоце Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А. Куляшова. Таксама сярод прэтэндэнтаў на сенатарскі партфель Аляксей Кушнарэнка, генеральны дырэктар «Белпалівагаза», якога вылучылі Быляніцкі, Круглянскі і Шклоўскі райсаветы, Ігар Каско, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы (ад Клімавіцкага, Крычаўскага, Хоцімскага і Чэрыкаўскага райсаветаў), Валерый Палішчук, начальнік Магілёўскага інстытута МУС Беларусі (ад Горацкага, Дрыбінскага і Мсціслаўскага Саветаў дэпутатаў) і Алег Портнік, дырэктар саўгаса «Дабраволец» (ад Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раённых Саветаў дэпутатаў).

* * *

**Міншчына вызначылася са сваімі кандыдатамі ў члены Савета Рэспублікі, сярод якіх — старшыня абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая.**

Спіс размешчаны на сайце ЦВК. Так, кандыдатуру Наталлі Віктараўны вылучылі на прэзідыумах Саветаў дэпутатаў Любанскага, Слуцкага і Старадарожскага раёнаў. Сярод іншых прэтэндэнтаў — Валерый Гайдукевіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Алег Суконка, дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, Іван Галаваты, генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій», Уладзімір Лук'янаў, генеральны дырэктар ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», Каліна Капуцкая, дырэктар СШ № 14 г. Маладзечна. Таксама ў спісе прозвішчы Алены Зяблікавай, старшыні Барысаўскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў і Аляксандра Бачылы, начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама.

* * *

**Гомельшчына прапанавала сваіх сем кандыдатаў на месца ў Савеце Рэспублікі.**

Так, сярод прэтэндэнтаў — Таццяна Абель, мастацкі кіраўнік народнага цырка імя Валерыя Абеля; Уладзімір Катовіч, загадчык аддзялення мікрахірургіі вока № 1 Гомельскай абласной спецыялізаванай клінічнай бальніцы; Аляксей Нявераў, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі; Алег Слінько, дырэктар камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара»; Ганна Смаляк, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа; Андрэй Шышкін, галоўны рэдактар установы «Рэдакцыя газеты «Свабоднае слова»; Фелікс Яшкаў, начальнік Гомельскай мытні.

# бюджэтах з'явяцца магчымасці



шэраг мер, якія датычацца падтрымкі асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў. Пакуль гэтая работа ў стадыі станаўлення, але ўжо можна разлічваць на яе эфектыўнасць.

Прамоўца не абмінуў увагай актыўную і насычаную міжнародную дзейнасць членаў Савета Рэспублікі па пашырэнні міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Знакавым мерапрыемствам у гэтым сэнсе стаў VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбыўся ў Санкт-Пецярбургу. На думку Міхаіла Мясніковіча, форумы рэгіёнаў увогуле сталі прывабным прыкладам для наладжвання цеснага супрацоўніцтва з іншымі краінамі. Сёлета ў ліпені па ініцыятыве Савета Рэспублікі ўпершыню адбыўся такі форум сумесна з Узбекістанам. Сенатары таксама ўдзельнічалі ў беларуска-польскім форуме «Добрасуседства-2019».

Але Расія — наш ключавы і стратэгічны партнёр. Таму варта ўлічваць падыходы па паглыбленні інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, сфармуляваныя ў абноўленай Праграме дзеянняў. Дарэчы, Савет Рэспублікі прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гэтага дакумента. Работы па яго рэалізацыі чакаецца шмат. Ураду, Нацыянальнаму банку з удзелам парламентарыяў і іншых ведамстваў і арганізацый трэба будзе распрацаваць больш за 30 беларуска-расійскіх дарожных карт, сказаў Міхаіл Мясніковіч.

У заканатворчым партфелі шмат ініцыятыў, якія накіраваны на вырашэнне паўсядзённых праблем людзей. Гэта законапраекты «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг», «Аб ахове працы», «Аб пажарнай бяспецы», «Аб персанальных даных» і іншыя.

**Леанід ТУГАРЫН.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

## Новыя рэаліі — новыя законы

**Падчас сёмай сесіі Савета Рэспублікі быў зацверджаны шэраг важных законапраектаў. Засяродзімся на асобных.**

Як вядома, законы, як і людзі, пад уздзеяннем часу і перамен паступова старэюць. Тады заканадаўцам даводзіцца іх, так бы мовіць, амаладжваць, прыводзіць у адпаведнасць з патрабаваннямі новых рэалій. Пра неабходнасць унясення змен у дагавор паміж Беларуссю і Расіяй аб ваенным супрацоўніцтве яшчэ ад 19 снежня 1997 года расказаў членам Савета Рэспублікі міністр абароны Андрэй Раўкоў. Яго судакладчык Сяргей Рахманаў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, падтрымаў міністра. Прагаласавалі аднагалосна.

Праект закона аб ратыфікацыі дагавора паміж Беларуссю і Польшчай аб сацыяльным забеспячэнні прадставіла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч. Нагадаем, што галоўная мэта дагавора — гарантаваць грамадзянам абедзвюх краін аб'ектыўнае фарміраванне сацыяльных (пенсійных) правоў і іх рэалізацыю незалежна ад месца жыхарства. Гэта датычыцца ўплаты ўзносаў на абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і абавязковае страхаванне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці, прафесійных захворванняў у перыяд работы ў Беларусі ці Польшчы. Узносы трэба будзе адлічваць у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы, на тэрыторыі якой грамадзяне працуюць.

Як адзначыла ў адказах на пытанні міністр працы і сацабароны, цяпер ідзе распрацоўка падобных пенсійных дагавораў з Малдовай, Балгарыяй, Латвіяй, Літвой і іншымі краінамі.

Адносін з Польшчай датычыцца яшчэ адзін законапраект, які быў прыняты членамі Савета Рэспублікі, — аб ратыфікацыі дагавора паміж урадамі Беларусі і Польшчы аб утрыманні пагранічных чыгуначных маставых аб'ектаў на беларуска-польскай граніцы. Мяркуецца, што ўступленне ў сілу дагавора дазволіць урэгуляваць спрэчныя пытанні, павысіць бяспеку руху цягнікоў, у цэлым палепшыць чыгуначныя зносіны паміж краінамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## АДКАЗНЫ ПАДЛІК

### Хто будзе працаваць на выбарчых участках?

**На месцы ва ўчастковых выбарчых камісіях на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання прэтэндуе каля 67,7 тысячы чалавек. Такія звесткі размешчаны на сайце Цэнтрвыбаркама, паведамляе БелТА.**

Усяго ў Беларусі будзе сфарміравана 5 785 участковых выбарчых камісій. Ад грамадзян шляхам падачы заяў у іх склад вылучана прыкладна 23,2 тысячы чалавек (34,3 % агульнай колькасці), ад працоўных калектываў — больш за 7,4 тысячы (11 %). На долю грамадскіх аб'яднанняў прыпадае 48,2 % агульнай колькасці вылучэнцаў — больш 32,6 тысячы чалавек. Палітычныя партыі вылучаюць амаль 4,4 тысячы чалавек (6,5 %). Сярод грамадскіх аб'яднанняў найбольшую актыўнасць праявілі прафесійныя саюзы, ад якіх у склад участковых камісій вылучана каля 9,2 тысячы чалавек, або 13,6 % агульнага ліку прэтэндэнтаў. Лідар сярод партый — РППС (Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці), якая прэтэндуе на 1,1 тысячы месцаў (1,68 %).

Нагадаем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаны на 17 лістапада, у Савет Рэспублікі — на 7 лістапада.

ВЫБАРЫ-2019

## Адкрыта і ўважліва

**На парламенцкіх выбарах акрэдытаваны першыя назіральнікі ад БДІПЧ АБСЕ.**

ЦВК Беларусі акрэдытаваў першых назіральнікаў ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, якія будуць працаваць на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання. Па звестках на 30 верасня, адпаведныя пасведчанні атрымалі чатыры чалавекі. Такая інфармацыя размешчана на сайце Цэнтрвыбаркама, паведамляе БелТА.

Усяго ЦВК акрэдытаваў 103 міжнародных назіральнікаў, з якіх 99 прадстаўляюць СНД. У складзе місіі ад Садружнасці 25 чалавек ад Міжпарламенцкай асамблеі краін — удзельніц СНД.

Дарэчы, Беларусь накіравала запрашэнні назіраць за парламенцкімі выбарамі таксама такім міжнародным арганізацыям, як ПА АБСЕ, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва. У сваю чаргу Цэнтрвыбаркам Беларусі запрасіў назіраць за выбарчай кампаніяй калег з краін былога СССР, акрамя Эстоніі і Літвы, экспертаў з Сусветнай асацыяцыі арганізатараў выбараў, якая знаходзіцца ў Карэі, а таксама прадстаўнікоў ЦВК гэтай краіны.

## Для зручнасці ў рабоце

**Інфацэнтр ЦВК будзе працаваць у малой зале Палаца Рэспублікі.**

Інфармацыйны цэнтр Цэнтральнага выбарчага камітэта «Выбары-2019» адкрыецца 17 лістапада ў малой зале Палаца Рэспублікі ў Мінску. Пра гэта журналістам расказала старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, паведамляе БелТА.

Па яе словах, першая прэс-канферэнцыя ў інфацэнтры адбудзецца 17 лістапада ў 10.00. Па традыцыі ён размесціцца ў малой зале Палаца Рэспублікі. Старшыня ЦВК адзначыла, што гэта зручнае месца ў цэнтры горада, яго лёгка знаходзяць усе замежныя журналісты і назіральнікі. Менавіта для іх у першую чаргу ствараецца інфацэнтр. Лідзія Ярмошына нагадала, што нацыянальныя назіральнікі акрэдытацыі для работы ў ім не маюць. «Проста для гэтага спатрэбіўся б стадыён, таму што ў нас нацыянальных назіральнікаў дзясяткі тысяч. Ужо зараз іх больш за 500 чалавек акрэдытавана ў выбарчых камісіях», — сказала яна.

Упершыню інфацэнтр быў адкрыты ў 2001 годзе на выбарах Прэзідэнта.

## Нават за межамі краіны...

**На выбарах у беларускі парламент змогуць прагаласаваць і беларусы, якія часова знаходзяцца ў Расіі.**

На ўчастках, утвораных на тэрыторыі Расіі, па выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі змогуць прагаласаваць беларускія грамадзяне, якія пастаянна пражываюць або часова знаходзяцца ў краіне-суседцы. Пра гэта гаворыцца ў інфармацыі, размешчанай на сайце пасольства Беларусі ў Расіі, паведамляе БелТА.

На тэрыторыі Расіі ўтвораны тры ўчасткі для галасавання: у Маскве, Санкт-Пецярбургу і Калінінградзе. «Грамадзяне Беларусі, якія пастаянна пражываюць або часова знаходзяцца на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, могуць прыняць удзел у выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання на вышэйзгаданых участках для галасавання ў перыяд датэрміновага галасавання з 12 да 16 лістапада 2019 года ўключна (з 10.00 да 14.00 і з 16.00 да 19.00), а таксама ў асноўны дзень галасавання — 17 лістапада 2019 года (з 8.00 да 20.00), — гаворыцца ў паведамленні. — Пры сабе неабходна мець дакументы, якія сведчаць асобу і пацвярджаюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь».

На сайце дыпмісіі апублікаваныя таксама склады ўчастковых выбарчых камісій у Маскве, Санкт-Пецярбургу і Калінінградзе, іх месцазнаходжанне і кантактныя даныя.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

## Законнасць — у згодзе з Канстытуцыяй

### Супрацоўніцтва дэпутатаў з іншымі галінамі ўлады садзейнічае знаходжанню рашэнняў у інтарэсах грамадзян

**З такім тэзісам выступіў Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце падчас круглага стала на тэму «Актуальныя пытанні механізма ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў па забеспячэнні канстытуцыйнай законнасці». Сустрэча прымеркавана да святкавання 25-годдзя прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і станаўлення інстытута прэзідэнцтва.**

Важную ролю ў падтрыманні законнасці ў адпаведнасці з галоўным дакументам краіны адыгрывае Канстытуцыйны суд. Узаемадзеянне парламента з гэтай інстанцыяй павінна развівацца і набываць новыя формы.

«Адбываюцца далейшае ўдасканаленне канстытуцыйнай судаўтворчасці і пашырэнне доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя. У вобласці ўмацавання канстытуцыйнай законнасці неабходна адзначыць ролю Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, які забяспечвае падрыхтоўку праектаў заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь і метадычнага кіраўніцтва нарматворчай дзейнасцю; пракуратуры, якая ажыццяўляе нагляд за дакладным і аднолькавым выкананнем нарматыўных актаў на тэрыторыі нашай краіны; Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, якое ўдзельнічае ў прававым забеспячэнні нарматворчай дзейнасці», — паведаміў Леанід Цупрык.

— Умацаванне канстытуцыйнай законнасці заклікана захаваць канстытуцыйную ідэнтычнасць нацыі ва ўмовах глабалізацыі і інтэграцыі, забяспечыць устойлівае дзяржаўнае развіццё і грамадзянскую згоду, — упэўнена **намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда Беларусі Наталля КАРПОВІЧ.**

Менавіта гэты орган ажыццяўляе кантроль за канстытуцыйнасцю прынятых у краіне законаў. Дзейнасць па рэалізацыі паўнамоцтваў Канстытуцыйнага суда адлюстроўваецца ў яго штогадовых пасланнях Прэзідэнту і палатам парламента. Акрамя прапаноў, яно змяшчае аналіз вывучаных спраў і матэрыялаў. У сакавіку 2020 года адбудзецца юбілейнае, 25-е, прынясенне паслання Канстытуцыйнага суда.

«Я не магу не адзначыць, што некаторыя пасылы, якія патрабуюць далейшай увагі заканадаўца і ўсіх суб'ектаў правапрымянення, змяшчаюцца ў пасланнях Канстытуцыйнага суда. І Канстытуцыйны суд на іх звяртае ўвагу штогод. Гэта ў першую чаргу датычыцца праблем рэалізацыі ўскоснага доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя, — канстатавала намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда. — Абарона правоў грамадзян, іх доступ да правасуддзя — гэта найважнейшыя праявы прававой дзяржавы і ў тым ліку рэжыму канстытуцыйнай законнасці. І у гэтым плане мы павінны ўзмацніць сваё ўзаемадзеянне».

Зараз у гэтай сувязі разглядаецца магчымасць прамога звароту грамадзяніна ў Канстытуцыйны суд з прапановай праверкі канкрэтнага акта, які ён ставіць пад сумненне.

Наталля Карповіч адзначыла, што забеспячэнне належнага стану канстытуцыйнай законнасці — гэта найважнейшы вынік дзейнасці ў завершаным годзе ўсіх органаў дзяржавы, яе службовых асоб і іншых суб'ектаў адносін.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## З РОЗНЫХ КРЫНІЦ

**Беларусь прыцягне сродкі Сусветнага банка для фінансавання цеплавой мадэрнізацыі жылля. Пра гэта ішла размова на сустрэчы намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Кухарава з кіраўніком прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Алексам Крэмерам.**

Віцэ-прэм'ер нагадаў, што не так даўно быў падпісаны Указ № 327 «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрных жылых дамоў». Такім чынам, падыходы па павышэнні энергаэфектыўнасці жылля замацаваны ў асобным нарматыўным дакуменце. Зараз рыхтуецца шэраг унутраных дакументаў, якія вызначаць парадак работы ў гэтым кірунку. «Мы далі дaручэнне рэгіёнам, каб яны ўжо пачалі гэтую работу з насельніцтвам», — адзначыў Уладзімір Кухараў.

«Урад будзе трымаць на асаблівым кантролі рэалізацыю гэтых мерапрыемстваў, каб мы ў самыя кароткія тэрміны маглі пачаць работу ў гэтым кірунку», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Алекс Крэмер у сваю чаргу прапанаваў разгледзець магчымасць падрыхтоўкі праекта па павышэнні энергаэфектыўнасці грамадскіх будынкаў. «Пакуль што мы не вызначылі суму, якая будзе выдзелена. Мы хацелі б скарыстацца гнуткім падыходам, каб удакладніць памер сродкаў у працэсе падрыхтоўкі праекта ў залежнасці ад выяўленых патрэб», — удакладніў ён.

Па яго словах, неабходна падрыхтаваць праект і ўнесці адпаведную прапанову на разгляд Савета дырэктараў Сусветнага банка ў канцы 2020 года. «Нягледзячы на тое, што дата здаецца аддаленай, каб укласціся ў тэрміны, трэба распачынаць работу як мага хутчэй», — дадаў Алекс Крэмер .

Нагадаем, што Указ № 327 «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрных жылых дамоў» вызначае ўмовы і механізмы ўдзелу ўласнікаў жылых і нежылых памяшканняў у фінансаванні энергаэфектыўных мерапрыемстваў па зніжэнні спажывання цеплавой энергіі ў шматкватэрных жылых дамах, скарачэнні выдаткаў на ацяпленне і павышэнні спажывецкіх характарыстык такіх дамоў. Згодна з указам рашэнне аб правядзенні названых мерапрыемстваў на добраахвотнай аснове прымае агульны сход удзельнікаў сумеснага домаўладання, калі за яго прагаласавалі ўласнікі, якія маюць больш чым дзве трэціны галасоў.

Прадугледжваецца, што ў фінансаванні энергаэфектыўных мерапрыемстваў магчымы долевы ўдзел бюджэту і ўласнікаў, а таксама прыцягненне на гэтыя мэты іншых крыніц, уключаючы пазыковыя сродкі міжнародных крэдытна-фінансавых арганізацый.

**Паводле БелТА.**

# ЯК СЭКАНОМІЦЬ ХАЛАДАМІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Каб вызначыць стан трубы і вырашыць, ці настаў ужо час мяняць яе, акрамя паказчыкаў сістэмы САДК, арыентуюцца і на тое, ці здараліся на цеплаправодзе прарывы за час эксплуатацыі. Нарэшце, для поўнай карціны можна зрабіць шурфоўку — адкапаць частку цеплатрасы і паглядзець на яе стан.

Труба, якая падчас службы «праштрафілася», ставіцца ў план на замену, або рамантуецца пэўны кавалак яе. Рэдка калі патрабуецца рамонт ізаляцыі, бо на сучасных трубах пашкодзіць вонкавую абалонку амаль немагчыма. А праблема непасрэдна падчас пракладкі цеплатрас можа быць толькі адна: калі камунальнікі не паспяваюць скончыць работы ў час, сцвярджае прадстаўніца ЖКГ.

Яшчэ здараецца (праўда, крайне рэдка), што цеплатрасу немагчыма правесці пад зямлёй і даводзіцца рабіць паветраную пракладку — уладкоўваць трубы ў ацынкаванай абалонцы звонку, па-над глебай, як пракладваюцца газавыя камунікацыі. Аднак гэта вельмі не вітаецца, бо ў такім выпадку большая цеплавая страты. У 2016-м, напрыклад, цеплатрасы краіны агулам страцілі 12 % цеплаэнергіі, а летась — ужо 10,3 %.

— *Сеткі перакладваюцца за кошт мясцовых бюджэтаў. Ёсць і людскія рэсурсы, і тэхніка, і праекціроўшчыкі, аднак сродкаў часта не хапае. У прысталічнай вобласці на перакладку цеплаcетак камунальнікам нават даводзіцца браць крэдыты,* — адзначыла Святлана Цімошкіна. — *Тым не менш да канца года заданне па замене цеплатрас будзе цалкам выканана.*

### Індывідуальны разлік таннейшы

Каб плаціць за цяпло менш, беларусы могуць пачаць разлічвацца па паказчыках індывідуальных прыбораў уліку (ІПУ) цеплаэнергіі або па размеркавальніках цяпла на батарэях. Атрымаць дадаткова зніжку ў 5 % могуць жыхары, у чых кватэрах па праекце сталі прыборы ўліку, але яны раней не разлічваліся па іх. Калі ж дакументацыяй ІПУ ў доме не прадугледжваліся, а людзі самі ўсталявалі іх і плацяць па атрыманых на прыборах лічбах, ім прапануецца 10-працэнтная зніжка. Такія ўмовы даюцца цягам трох гадоў з моманту пачатку разліку па ІПУ.

— *Сістэма зніжак пачала працаваць летась, і за гэты час ёй скарысталася каля 3400 чалавек,* — заўважыла **Жанна ПАПУЧЭВА, начальнік аддзела ўпраўлення эканомікі ЖКГ.** — *Сэканомленыя сумы адрозніваюцца — у сярэднім сем рублёў, аднак ёсць прыклады, калі лічбы даходзяць да 15 рублёў. Прычым гэта датычыцца выпадкаў разліку па субсідзіраваных тарыфах. У кватэрах жа, дзе ніхто не пражывае, да аплаты «камуналкі» прымяняецца эканамічна абгрунтаваны тарыф — з 1 чэрвеня ён складае 88,99 рубля. Для такога жылля, асабліва вялікай плошчы, усталяванне ІПУ для разліку робіцца яшчэ больш выгадным.*

Атрымаць пераразлік за папярэднія гады, калі прыборы ў кватэрах існавалі, але жыхары па іх не плацілі, немагчыма, удакладняе Жанна Папучэва:

— *Каб пачаць разлічвацца па прыборах, людзям трэба паведаміць пра сваё жаданне эксплуатуючай арганізацыі. Тая праверыць агульны сход, дзе раскажа жыхарам, як праводзіцца разлік. Грамадзяне выберуць разліково-сэрвісную арганізацыю, якая апламбіруе іх прыборы на батарэях, і вызначаць перыяд для разліку: штомесяц або па завяршэнні сезона. Пры апошнім варыянце жыхарам падчас ацяплення будзе налічвацца плата па паказчыках групавога прыбора ўліку цяпла і плошчы кватэры. А лічбы з ІПУ здымуць пасля адключэння ацяплення і зробяць пераразлік.*


Фота БелТА.

Паколькі плата за ацяпленне ўсё роўна пастаянна ўзрастае за кошт падаражання энерганосьбітаў, разлік па ІПУ будзе зусім не лішні, мяркуюць камунальнікі.

— Калі людзі пачынаюць разлічвацца па паказчыках індывідуальных прыбораў, яны ўжо рэгулююць тэмпературу ў сваіх кватэрах, выбіраючы індывідуальны градус. У выніку гэта прыводзіць да значнага скарачэння цеплаcпажывання па ўсім доме, — заўважае начальнік аддзела. — Адпаведна, траціцца менш паліва на забеспячэнне цяпла, скарачаецца колькасць выкідаў у атмасферу, так што гэта выгадна ўсім і дазваляе сэканоміць за ацяпляльны сезон да 40—50 рублёў.

### Без накіпу і з торфам

Сталіца — лідар па даўжыні цеплаcетак. У Мінску больш за 4000 кіламетраў трубаправодаў, 2600 з якіх знаходзіцца на балансе філіяла Мінэнерга – «Мінскіх цеплавых сетак», а 1400 — пад наглядам прадпрыемства «Мінсккамунцеплаcетка».

Падрыхтоўка да ацяпляльнага сезона пачынаецца не з адключэння гарачай вады ў кватэрах, як можна падумаць, а з распрацоўкі графіка ў студзені—лютым, калі сезон у разгары. Графік гэты змяшчае ў сабе не толькі сезоннае адключэнне вады, але і рамонт абсталявання цеплакрыніц, будынкаў і збудаванняў, а таксама рэканструкцыю (замену старых камунікацый новымі), паведамілі ў «Мінскіх цеплавых сетках».

Сёлета на апрасоўку і рамонт выводзілася 96 участкаў цеплaмагістраляў. Гэта 6880 дамоў, 463 дашкольныя ўстановы і 293 школы. Адрамантаваны цеплаcеткі на 87 аб'ектах.

У выніку рамонту заменена 15,197 кіламетра цеплаcетак (запланавана 20 кіламетраў). За 2019 год ліквідавана 481 пашкоджанне, у тым ліку 147 — на цепламагістралях. Здзейснена 77 бягучых рамонтаў асноўнага абсталявання цеплакрыніц са 116 запланаваных, рамантуецца помпавае абсталяванне ЦЭЦ-2 і кацельнай. Падчас рэканструкцыі і капітальнага будаўніцтва перакладзена 26,728 кіламетра цеплаcетак, з прымяненнем ПІ-труб — 25,770 кіламетра.

Рыхтавацца да сёлетняга ацяпляльнага сезона ў «Мінсккамунцеплаcетцы» таксама пачалі рана, у красавіку.

— Замянілі 33 з 54 запланаваных кіламетраў цеплаcетак, правялі гідраўлічныя іспыты трубаправодаў працягласцю 625 кіламетраў, адрамантавалі 39 кацельняў і 160 цэнтральных цеплапунктаў. Ачысцілі паверхню нагрэву, знялі накіп, усё прамылі, — падзяліўся лічбамі **Уладзіслаў ЛЕВІН, галоўны інжынер прадпрыемства «Мінсккамунцеплаcетка».** — Па выніках дыягностыкі лабараторыі зваркі дэфектныя ўчасткі труб замянілі новымі.

Новыя тэхналогіі дазваляюць зніжаць пашкоджвальнасць цеплатрас. Сёлета іх стала амаль удвая менш. Пры гэтым трубаправоды рэгулярна аглядаюць, мяняюць лакальна старыя пракладкі, зношаную ізаляцыю.

Кацельні «Мінсккамунцеплаcеткі» працуюць як на газе, так і на мясцовых відах паліва, у асноўным на шчапе, якую і набываюць, і робяць самі. Магчыма, будуць выкарыстоўваць фрэзерны торф у выглядзе крошкі, бо, як мяркуецца, праз пэўны час торф будзе каштаваць прыблізна ўдвая танней, чым шчапа.

**Ірына СІДАРОК.**

УЛАСНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ

# Капітальны рамонт:

**Рана ці позна кожнаму ўласніку давядзецца сутыкнуцца з сур'ёзным рамонтам свайго шматкватэрнага дома. Што трэба ведаць аб яго правядзенні?**

Падставамі для капітальнага рамонту ў жылым доме з'яўляюцца перспектыўныя праграмы (на пяць гадоў) і бягучыя графікі (на адзін год). Іх распрацоўваюць і зацвярджаюць мясцовыя органы ўлады. Калі капітальны рамонт не можа быць зроблены без высялення жыхароў, то на час работ ім даецца жылое памяшканне манеўранага фонду, паведамляе партал камунальнай адукаванасці gkx.by. Калі ўласнік адмаўляецца пакінуць сваё жыллё, яго могуць выселіць праз суд.

Калі мы кажам пра тэхнічны стан дома, то трэба разумець, што ў любога будынка ёсць мінімальны тэрмін эфектыўнай эксплуатацыі. Ён залежыць ад умоў (тэмпературы, вільготнасці, якасці тэхнічнага абслугоўвання) і ад матэрыялаў, якія былі выкарыстаныя пры будаўніцтве дома (панэлі, цэгла). У сярэднім тэрмін складае ад 15 да 25 гадоў. Аднак трэба разумець, што гэта тэрмін мінімальны, і калі па яго заканчэнні дом знаходзіцца ў добрым стане, то гэта зусім не гарантуе вам правядзенне капітальнага рамонту.

### Хто плаціць і за што?

Капітальны рамонт выконваецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў і адлічэнняў грамадзян. Штомесячная аплата капітальнага рамонту пералічваецца на спецыяльныя рахункі, якія адкрыты ў мясцовых органах улады або таварыстваў уласнікаў. Калі грошы пералічвалі на рахункі мясцовых органаў улады, то работы будуць выконвацца за кошт сабраных сродкаў і мясцовых бюджэтаў. Калі ж грошы трапілі на рахункі таварыстваў, то рамонт у такіх дамах будуць рабіць выключна за кошт дадзеных сродкаў. Але пры гэтым ва ўласнікаў жылля будзе магчымасць пералічыць сабраную суму мясцовым органам улады і атрымаць падтрымку ад дзяржавы.

### Што будзе зроблена?

Галоўная мэта капітальнага рамонту жылых будынкаў — аднавіць асноўныя якасці пабудовы, страчаныя падчас эксплуатацыі: фізічныя, тэхнічныя, спажывецкія, эстэтычныя.

Абавязковыя віды работ пры капітальным рамонце: рамонт даху і фасаду будынка (стыкі, швы, балконы, лоджыі, прыступкі, брылі), а пры прамярзанні — уцяпленне асобнымі фрагментамі тарцоў. Акрамя таго, прадугледжана замена запаўненняў аконных праёмаў і ўваходных дзвярных праёмаў у месцах агульнага карыстання, а таксама сістэм халоднага (гарачага) водазабеспячэння, каналізацыі і водаадвядзення (у падвалах і па стаяках кватэр). Сюды ж уваходзіць замена электрашчытавой, электраправодкі і электрашчыткоў у месцах агульнага карыстання.

Тэлесеткі

## ЧАС ГЛЯДЗЕЦЬ, ЧАС РАЗВАЖАЦЬ

**Сацыякультурны канал «Беларусь 3» падрыхтаваў новыя серыі праекта «Час кіно», прымеркаваныя да 95-годдзя айчыннага кінематографа. У цэнтры ўвагі тэлевізійнікаў — як навінкі, так і найлепшыя ўзоры «старога» беларускага дакументальнага кіно, а таксама яго аўтары.**

Ужо сёння пачне гаворку пра нацыянальную школу дакументалістыкі вядомы рэжысёр і аператар Анатоль Алай. Яго новая работа «Доктар Шуба» (2019) апавядае пра лёс выдатнага беларускага хірурга, былога галоўурача 1-й клінічнай бальніцы Мінска Аляксея Шубы: ад таго часу, як малады ўрач у пачатку вайны вымушаны быў узначаліць санітарны цягнік, маючы ў памочніках толькі маладых медсясцёр і санітарак, да выклікаў сучаснасці, з якімі заслужанаму ўрачу БССР давялося мець справу.




У наступных выпусках — 11 і 18 кастрычніка — гледачы сустрэнуцца з Вольгай Дашук і яе фільмам «Полацкі вальс» (2018), а таксама з аўтарам дакументальнай стужкі «Вялікае падарожжа князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі» (2017) Юрыем Цімафеевым.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ПАМЯЦЬ ЖЫВАЯ

**Гэта сцвярджае цыкл дакументальных фільмаў «Фарбы памяці», героі якога — дзесяць беларускіх мастакоў, чые творы сталі горкім і праўдзівым адлюстраваннем Вялікай Айчыннай вайны.**

Прэм'ерны выпуск, які выйдзе на «Беларусь 3» ужо 6 кастрычніка, прысвечаны народнаму мастаку Беларусі Леаніду Шчамялёву — стваральнікі праграмы не толькі падрабязна вывучылі карціны, якія адлюстроўваюць розныя перыяды ў нялростым лёсе мастака, але таксама пабывалі ў яго творчай майстэрні, пазнаёміліся з дочкамі Маргарытай і Людмілай, таксама мастачкамі, паслухалі развагі сяброў і калег.

Наступны фільм 13 кастрычніка раскажа пра народнага мастака Беларусі Віктара Грамыку — удзельніка Вялікай Айчыннай, франтавіка, які паказаў «сваю» — і агульную — вайну ў вядомых карцінах «Салдаты», «1941 год. Над Прыпяццю», «Жанчынам Вялікай Айчыннай прысвячаецца», «Песня аб маім атрадзе» і іншых. Сярод наступных герояў праекта — Міхаіл Савіцкі, Май Данцыг, Яўген Зайцаў, Пётр Дурчын, Мікалай Залозны, Лазар Ран, Пётр Данелія і Эдуард Куфко.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 78

З нашай газетай звязана цікавая падзея з гісторыі шахматнай кампазіцыі — міжнародны конкурс складання задач-трохходовак, зладжаны «Звяздой» у 1928 годзе, першае спаборніцтва такога кшталту ў Беларусі. Даследчык гісторыі беларускіх шахмат В. Рубінчык піша: *«Пачаўся конкурс са сціплай аб'явы ў «Звяздзе» ад 8 красавіка 1928 года: «...Задачы прысылаюцца на дыяграмах у любой колькасці... Тэрмін конкурсу — з I—V да I—IX 1928 года. Прызы: 50 р., 40 р., 30 р., 20 р., 10 р. Суддзі: М. Нэйман (з Бабруйска, праце зараз у Ленінградзе), В. Кобец, Р. Шукевіч-Траццякоў». У чэрвені 1928 года «Звязда» сумясціла конкурс складання з «конкурсам развязвання» — найлепшым рашальнікам прапаноўваліся прызы «шахматнымі кнігамі па выбары пераможцы»... Так ці інакш, арганізатары здолелі прыцягнуць да спаборніцтва і пачаткоўцаў, і мэтраў; і жыхароў беларускай правінцыі (Капыль, Дуброўна), і складальнікаў з Расіі, Украіны, «капіталістычнага свету». На старонках газеты сустрэліся чэшская школа (Эміль Палькоска) і стратэгічная (Леанід Кубель, Яўген Умноў), а таксама адвечны «папулярны жанр».*

Адзначым, што па шэрагу прычын вынікі конкурсу былі абвешчаны толькі ў 1932 годзе — на старонках часопіса «Шахматы в СССР». Першы прыз атрымала задача сусветна вядомага складальніка Леаніда Кубеля (Ленінград). Другі прыз заваяваў Я. Умноў, трэці — Ф. Сімховіч, чацвёрты — П. Неўнывака, пяты — Л. Кубель. Ганаровыя водгукі размеркаваліся наступным чынам: першы — Э. Палькоска, другі — А. Гуляеў, трэці — Н. Пятровіч, чацвёрты — Н. Малахаў, пяты — О. Нема і М. Фейгль.

Як слушна адзначае В. Рубінчык: *«Да вынікаў конкурсу трэба ставіцца крытычна... Нават некаторыя прэміяваныя творы не былі пазбаўлены недахопаў — напрыклад, задача Ненада Пятровіча, што атрымала III ганаровы водгук, мела пабочнае рашэнне... З 43 задач не былі допушчаны да прысуджэння «задача асуджанага здраднікa-меншавіка Л. Б. Залкінда, а таксама задача С. С. Леўмана, выключанага з шэрагаў савецкай шахарганізацыі». Хоць усё тое не адмяняе заслуг кампазітараў, абвешчаных лаўрэатамі. У часопісе быў пададзены спіс краін, з якіх паходзілі ўдзельнікі: СССР, Чэхаславакія, Аўстрыя, Венгрыя і Югаславія. Забытымі чамусьці аказаліся Германія і Палесціна».*

Наступную конкурсную задачу склаў М. Штэйн (Мінск). Каментарый «Звязды» да яе быў такі: «Невялікая, мастацкі складзеная задача. Варыянты на дзіва прыгожыя» ***(гл. дыяграму)***.



***Белыя:*** Кре8, Се5, Kd4, Ke7, пп. e4, g2, h5 (7).

***Чорныя:*** Kph4, пп. h6, h7 (3).

Мат за 3 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Увогуле замена цепласетак не павінна сур'ёзна адбіцца на падачы цяпла ў кватэры, падкрэсліў суразмоўнік. Адзінае, што можа ствараць дыскамфорт, гэта часовае адключэнне цяпла пры ўрэзках новых ліній. Такія работы патрабуюць, як правіла, ад некалькіх гадзін да двух дзён. Пра гэта жыхароў інфармуюць загадзя. Што датычыцца пракладкі цеплатрасы, дык гэту работу вядуць не толькі камунальнікі, але і энергетыкі. Дарэчы, на іх балансе — большасць цепласетак горада. Але менавіта да камунальнікаў у гэтым плане больш прэтэнзій. Тыя, у сваю чаргу, маюць свой аргумент.

— Вы заўважылі, наколькі раней пачаўся сёлета ацяпляльны сезон? — задаецца пытаннем Павел Конеў. — А між тым сярэднясутачная тэмпература перавышае восем градусаў, што па нарматывах не дае падставы на падачу цяпла. Звычайна ацяпляльны сезон доўжыцца з 15 кастрычніка да 15 красавіка і займае 194 дні. Сёлета ён пачаўся яшчэ ў канцы верасня. Зразумела, што першымі атрымалі цяпло сацыяльныя аб'екты — дзіцячыя садкі, школы, бальніцы. Літаральна праз некалькі дзён цяпло прыйшло ў кватэры. А між тым не ўсе жыхары згодны з гэтым. Некаторыя лічаць, што ўключаць цяпло яшчэ рана, на вуліцы няма марозу.

У любым выпадку рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона прынята, і яго трэба выконваць. Зіма, як кажуць, спытае строга, у тым ліку і за расходаванне цеплаэнергіі. А ў вобласці сёлета пастаўлена задача знізіць цеплавыя страты на 10 %. Дасягнуць гэтага магчыма толькі праз мадэрнізацыю старых цепласетак. І ў тым выпадку, калі работа не будзе зацягнута на доўгі тэрмін.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**



## Віртуальны запыт паскарае рэальны вынік

**Партал «Мой Горад» 115.бел, які створаны з мэтай хуткага рэагавання на жыллёва-камунальныя праблемы беларусаў, актыўна выкарыстоўваецца жыхарамі Гомельшчыны. Ад іх за восем сёлетніх месяцаў было прынята каля 170 тысяч заявак.**

**Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Дзмітрый ЗГУРСКІ** расказаў, што 85 % агучаных у адзінай дыспетчарскай службе ЖКГ праблем вырашана станоўча. Для рашэння часткі патрабуюцца і значныя фінансавыя сродкі, і больш працяглыя тэрміны.

Дарэчы, большасць зваротаў паступае ад жыхароў буйных населеных пунктаў вобласці: Гомеля, Жлобіна, Мазыра, Светлагорска, Рэчыцы і Калінкавічаў. Гэта звязана з тым, што ў вялікіх гарадах больш шырокі спектр паслуг, а таксама большыя патрабаванні з боку жыхароў. Уся інфармацыя, якая трапляе ў кантакт-цэнтр, дэталёва аналізуецца спецыялістамі. У тым ліку для прыняцця стратэгічных рашэнняў, рацыянальнага размеркавання рэсурсаў:

— Аналіз такой інфармацыі дапамагае бачыць пэўныя праблемныя адрасы і аператыўна вырашаць пытанні, што там узнікаюць, — кажа Дзмітрый Згурскі. — Больш за палову заявак, якія трапляюць у службу 115 па Гомельскай вобласці вырашаюцца ў той жа дзень. За вызначаны тэрмін больш за 92 тысячы заявак са 170 тысяч было вырашана на працягу дня, на працягу двух дзён — яшчэ 30 тысяч, для рашэння яшчэ 10 тысяч спатрэбілася тры дні. Час для рэагавання адказнымі службамі па той ці іншай заяўцы рэгламентаваны нарматыўнымі дакументамі. Так, пытанні, звязаныя з бяспекай людзей, павінны вырашацца неадкладна. Для гэтага створаны аварыйныя брыгады. Між тым у рэгіёне былі выпадкі, калі заяўкі асобнымі спецыялістамі выконваліся са спазненнем ці невысокай якасцю. Менавіта таму з пачатку года за розныя парушэнні прыцягнуты да адказнасці 45 службовых асоб.

Што датычыцца абласнога цэнтра, то, па інфармацыі **начальніка аператыўна-дыспетчарскай службы КВУП «Гомельская гарадская ЖКГ» Андрэя МАРКЕВІЧА,** на партале зарэгістравана 1,5 тысячы гамяльчан. Пры гэтым толькі адзін з карыстальнікаў адправіў звыш 1,2 тысячы зваротаў, яшчэ шэсць гараджан адправілі больш чым па 200 зваротаў, трое — па 150.

Часцей за ўсё гамяльчане ўзнімаюць тэмы, якія датычацца дарожна-маставой гаспадаркі, вулічнага асвятлення, азелянення, санітарнага стану і водазабеспячэння.

Сёння зваротная сувязь з грамадзянамі на партале рэалізуецца праз магчымасць прагляду статусу апрацоўкі апублікаванага запыту, а таксама аналізу вынікаў работы па запыце ў фармаце малюнкаў «было» і «стала». Грамадзянін мае магчымасць уплываць на рэйтынг арганізацыі, калі ацэньвае якасць выкананай работы.

Між тым у краіне завяршаецца мадэрнізацыя партала «Мой горад» 115.бел з пераходам на платформу «Мая рэспубліка». Новы сэрвіс будзе прапаноўваць пашыраны функцыянал. Напрыклад, карыстальнікі змогуць убачыць у рэжыме «анлайн» графікі адключэння водазабеспячэння, электрычнасці, знаёміцца з тым, як ідзе працэс выканання заявак...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# калі яго робяць і за чый кошт?

Падчас такіх работ ажыццяўляецца рамонт і замена ўнутрыдамавых інжынерных сістэм электра-, цепла-, газа- і водазабеспячэння, водаадвядзення, супрацьдымнай абароны, установак супрацьпажарнай аўтаматыкі, а таксама каналізацыйных выпускаў у адпаведнасці з межамі балансавай прыналежнасці і эксплуатацыйнай адказнасцю бакоў, а таксама рамонт падмурка і аднаўленне адмосткі.

### Што не робяць

Пры капітальным рамонце жылога дома ў індывідуальным памяшканні не робяць замену вокнаў, сантэхнікі, электраправодкі, электра- і газавага абсталявання, прыбораў уліку цепла- і электраэнергіі, расходу вады. Падчас такога рамонту не прадугледжаны абсталяванне дзіцячых пляцовак і дадатковых парковачных месцаў, а таксама рамонт лесвічных клетак і падвальных памяшканняў.

### Якая роля заказчыка?

Яшчэ на стадыі афармлення праекта камунальнікі павінны правесці агульны сход жыльцоў. Вельмі важна не ігнараваць яго правядзенне, бо на сходзе будуць абмяркоўвацца вашы пажаданні і патрабаванні як уласніка, а таксама неабходнасць іх уключэння ў праектна-каштарысную дакументацыю. На сходзе таксама вырашаюцца пытанні, якія датычацца ўцяплення дома і ўстаноўкі індывідуальных прыбораў уліку (за кошт асабістых сродкаў уласнікаў).

Прадстаўнікі заказчыка павінны праінфармаваць аб выніках абследавання жылога дома, запланаваных відах работ і паведаміць кантактныя звесткі адказных асоб. Уласнікі, са свайго боку, павінны выбраць прадстаўніка на час капрамонту.

### Колькі доўжыцца?

Тэрмін уводу дома ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту павінен быць прапісаны ў дагаворы. У цэлым нормы працягласці работ па капітальным рамонце пазначаны ў дакументах, зацверджаных Міністэрствам ЖКГ. Аднак тэрміны могуць быць перанесены, але толькі пры наяўнасці аб'ектыўных прычын. Гэта могуць быць форс-мажорныя абставіны (адзін з уласнікаў адмаўляецца даць доступ у кватэру для выканання пэўнага віду работ), значныя аб'ёмы дадатковых работ (калі іх неабходнасць была выяўлена пры правядзенні капітальнага рамонту), а таксама адсутнасць фінансавання на іх правядзенне. Прычым трэба ведаць, што ўвесці дом у эксплуатацыю заказчык зможа толькі пасля правядзення ўсіх работ, якія былі прадугледжаны праектам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

СРОДКІ І ВЫДАТКІ

# БОЛЬШ ЗА 150 РУБЛЁЎ ЗА «КВАДРАТ»

## Такі кошт капітальнага рамонту жылля на Брэстчыне. У каго танней?

**Камунальным службам Брэсцкай вобласці неабходна адшукаць рэзервы для зніжэння кошту капітальнага рамонту жыллёвага фонду. Такую задачу паставіў на выязным пасяджэнні аблвыканкама ў Бярозе яго старшыня Анатоль ЛІС.**

Як паведамляе БелТА, на пасяджэнні разглядалі рэалізацыю дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады і праблемныя пытанні работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці. Эфектыўнае і надзейнае функцыянаванне сістэмы ЖКГ з'яўляецца неад'емнай умовай для забеспячэння спрыяльнага асяроддзя і камфортнага пражывання грамадзян, адзначыў губернатар. Чакаецца, што большасць паказчыкаў дзяржпраграмы сёлета будзе выканана. Разам з тым ёсць пытанні, на якія варта звярнуць асаблівую ўвагу.

«Згодна з Дырэктывай № 7, у 2020 годзе неабходна забяспечыць дасягненне долі капітальна адрамантаванага жылля ў памеры 3 % ад эксплуатуемага. Па вобласці гэтая лічба складзе не менш за 380 тысяч метраў квадратных. Пры гэтым выкананне задання ў аб'ёме 310 тысяч квадратных метраў жылля па выніках бягучага года не праглядаецца, што недапушчальна, таму што гэта не проста лічба — за ёй стаяць людзі, якім неабходна адрамантаваць жыллё», — падкрэсліў Анатоль Ліс.



Самыя нізкія тэмпы ўводу дамоў пасля капрамонту ў Брэсце, Баранавічах, Бярозаўскім і Драгічынскім раёнах. Адной з прычын з'яўляецца перавышэнне гранічных нормаў выдаткаў рамонту на адзін «квадрат», што прыводзіць да недахопу выдзеленых на гэтыя мэты бюджэтных сродкаў. У прыватнасці, перавышэнні былі на дзевяці аб'ектах у Баранавічах, на адным аб'екце ў Кобрынскім раёне. Надзвычай затратным атрымліваецца рамонт малапавярховай жылой забудовы, старэйшай за 30 гадоў.

Сёння кошт рамонту аднаго «квадрата» жылля ў сярэднім па вобласці складае 154 рублі, гэта вышэй, чым у сярэднім па краіне (150 рублёў). У той жа час у Мінскай вобласці гэтая лічба не перавышае 120 рублёў.

«Аналіз паказвае, што выкананне работ па капітальным рамонце сіламі саміх прадпрыемстваў дазваляе знізіць кошт работ прыкладна на 25 %, а таксама сэканоміць час на правядзенне працэдур па выбары падраднай арганізацыі», — паведаміў **генеральны дырэктар абласнога ўпраўлення ЖКГ Аляксандр МАКСІМЧУК.**

Губернатар запатрабаваў, каб у наступным годзе кошт капрамонту аднаго квадратнага метра ў вобласці быў ніжэйшым, чым у сярэднім па краіне. «Вывучайце перадавы вопыт і выкарыстоўвайце ў сябе», — заявіў ён. У цэлым у кожным раёне павінен быць распрацаваны рабочы план па безумоўным выкананні заданняў дзяржпраграмы. «Для гэтага ёсць усе магчымасці. У нас створана цудоўная матэрыяльная база — адна з найлепшых сярод абласцей. І кадры захавалі. Сур'ёзна прапрацуйце пытанне. Мы кардынальным чынам павінны змяніць сітуацыю», — рэзюмаваў кіраўнік вобласці.

ІНІЦЫЯТЫВА

# А РАМОНТ ДАПАМОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ... ДЭПУТАТЫ

## Як у Магілёве насельніцтва разам з народнымі абраннікамі робіць утульнымі свае двары

**Кожны хоча жыць у прыгожым адрамантаваным доме і бачыць са сваіх вокнаў добраўпарадкаваную тэрыторыю. Але што рабіць, калі чарга на капрамонт яшчэ не падышла? Дзейнічаць. І дэпутаты першыя, хто ў гэтым пытанні змогуць дапамагчы.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Жыхары дома № 44 па вуліцы Маўчанскага пачалі з таго, што звярнуліся да свайго народнага абранніка **Віталя МАРТЫНАВА — дырэктара вагонабудаўнічага завода.** Сумна ім стала глядзець на свой двор. Таму размову пачалі з таго, што і самі не супраць укласці грошы ў яго развіццё. Сваімі сіламі яны сабралі больш за 800 рублёў. І яшчэ больш за 1200 рублёў выдзеліў гарсавет.

— Была закуплена дзіцячая пляцоўка для гульні, з'явіліся дадатковыя лаўкі, сметніцы, — расказвае Віталь Васілевіч. — Дырэктар «Магілёўзеленбуда» Пётр Аляксейчыкаў, таксама дэпутат гарсавета, дапамог з азяляненнем. Шчыравалі разам з жыльцамі, праводзілі сумесныя суботнікі. Да работы далучыліся і камунальнікі: зрабілі праезды, пешаходныя сцежкі. Непасрэдны ўдзел у вырашэнні пытання прыняла і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вольга Петрашова.

Віталь Мартынаў расказвае, што гэты дворык не адзіны за невялікі пакуль тэрмін яго дэпутацкай дзейнасці. Летась у гэтым жа мікрараёне быў прыведзены да ладу яшчэ адзін.

— Кожны год мы сумесна з прадстаўнікамі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна праводзім агляд двароў і высвятляем, наколькі грамадзяне гатовы паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні сваёй тэрыторыі, — кажа ён.— Нехта чакае, што двор зробяць за бюджэтныя грошы. Але ж мы усе добра ведаем, што напаўняльнасць бюджэту залежыць ад вынікаў работы рэальнага сектара эканомікі. Хацелася б, каб гэта напаўняльнасць была большая. Да таго ж ёсць першачарговыя пытанні, куды павінны накіроўвацца сродкі. Па плане работы па капрамонце выконваюцца, але заўсёды хочацца чагосьці большага.

Дэпутат прыводзіць прыклады ініцыятыўнасці грамадзян, калі яны не толькі на словах, але і на справе пацвярджаюць сваё жаданне жыць прыгожа. Бяруць у рукі рыдлёўкі, пэндзлі — капаюць, фарбуюць, саджаюць кветкі.

— Тэма добраўпарадкавання для мяне асабліва важная. У гэтым мікрараёне (выбарчая акруга № 27) жыве шмат работнікаў вагонабудаўнічага завода, якім я кірую, — кажа дэпутат. — І я лічу сваім абавязкам дапамагчы. Жыхары дома на Маўчанскага пажадалі, каб у двары з'явіўся дзіцячы цягнічок. Гэта цалкам па нашым профілі. Будзем нешта рабіць. Але пры гэтым заклікаю і астатніх да дзеяння. Нельга сядзець і чакаць, калі да цябе нехта прыйдзе і зробіць. Калі дом прыватны, чалавек імкнецца зрабіць яго прыгожым не толькі знутры, але і звонку. А чым адрозніваецца шматпавярховы жылы дом? Не трэба абмяжоўвацца выключна сваімі сценамі. Прыгожая тэрыторыя — гэта перш за ўсё справа рук саміх жыльцоў. Ды і трэба развівацца разам з горадам. Наводзім прыгажосць не толькі каля дамоў. Вунь адрамантавалі лесвіцу каля гандлёвага цэнтра «Кантынент». Гэта таксама вынік зваротаў жыхароў.

— Як толькі работы па добраўпарадкаванні пляцоўкі скончацца, правядзём свята двара, — кажа **старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Максім ГУРЫН.** — Збіраемся акцэнтаваць увагу на такіх праектах. Бо гэта не адзіны такі прыклад. Трэба паказаць, як працуюць з насельніцтвам магілёўскія дэпутаты. Летась падчас выязной сустрэчы з жыхарамі мікразоны пасёлка Грабянёва да дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Пятра Салаўёва звярнуліся маладыя сем'і з просьбай пасадзейнічаць ва ўладкаванні пляцоўкі для адпачынку ў раёне прыватнай індывідуальнай забудовы. На прапанову аб добраўпарадкаванні тэрыторыі адгукнуліся дэпутаты гарсавета Пётр Аляксейчыкаў, Іван Жук, Павел Ларчанка, Віктар Нікіцін. Сумесна з жыхарамі яны ачысцілі пляцоўку, абкасілі траву і зрэзалі хмызняк. З прыцягненнем прадпрыемстваў акругі неаднаразова ажыццяўлялуся падвоз грунту для выраўноўвання газона пад футбольнае міні-поле, тут з'явіліся дзіцячыя арэлі, гімнастычныя брусы, лава для адпачынку, былі прывезеныя матэрыялы, з якіх жыхары зрабілі сталы і лаўкі, плот, дзіцячыя малыя архітэктурныя формы. За кошт грамадзян устанавілі на дзіцячай пляцоўцы гульнявы комплекс. А маладыя сем'і з дапамогай старых аўтамабільных пакрышак і іншых другасных матэрыялаў упрыгожылі тэрыторыю. Вынікам добраўпарадкавання стала арганізаванае жыхарамі свята для дзяцей з запрашэннем аніматараў.

Пры дапамозе дэпутатаў гульнявыя пляцоўкі з'явіліся ў двух дварах па праспекце Шміта — у раёне дамоў №№ 32, 34, 36 і №№ 94, 96. Абсталяванне закуплена і ўстаноўлена сумеснымі намаганнямі дэпутатаў, адміністрацыі Кастрычніцкага раёна і жыхароў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

❍ У тэму

**Артур ГАРБАКОЎСКІ, начальнік аддзела эксплуатацыі жыллёвага фонду прадпрыемства ЖКГ Магілёўскай вобласці:**

— Тыя грошы, якія адлічваюць жыхары на капрамонт, акумулююцца на асобных субрахунках гар-, райвыканкамаў і накіроўваюцца выключна на капрамонт жыллёвага фонду, у адпаведнасці з зацверджанымі рашэннямі мясцовых выканаўчых органаў, бягучых графікаў на капрамонт жылога фонду. Комплекс работ плануецца, зыходзячы з тэхнічнага стану дома, года яго пабудовы, тэхнічнага стану канструкцыйных элементаў і гэтак далей. Бягучыя графікі капрамонту дамоў размешчаны на сайтах выканкамаў. На сённяшні дзень у вобласці плануецца адрамантаваць 122 дамы. Па звестках за восем месяцаў, усяго адрамантавана і ўведзена 151,2 тысячы метраў квадратных жылля — 63 дамы па вобласці.

# НОВЫЯ КАЦЕЛЬНІ

## хутка пачнуць працаваць у Добрушы і Буда-Кашалёве

**Да ацяпляльнага сезона 2019—2020 гадоў Гомельшчына гатова. Адпаведныя пашпарты атрымалі ўсе цеплакрыніцы, спажыўцы, арганізацыі, якія транспартуюць цеплавую энергію і знаходзяцца на абслугоўванні ЖКГ. На пасяджэнні Гомельскага аблвыканкама генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Дзмітрый ЗГУРСКІ расказаў пра тое, што зроблена.**

Цалкам праведзены прафілактычныя рамонты абсталявання кацельных, цэнтральных цеплавых пунктаў, унутрыдамавых інжынерных сетак. Больш за 110 кіламетраў цеплавых сетак заменена, адрамантавана звыш 103 тысяч метраў квадратных дахаў. Пры гадавым заданні ў 440 тысяч «квадратаў», за 9 месяцаў капітальны рамонт жылых дамоў правялі на 320 тысячах метраў квадратных — гэта 101,9 %.

У вобласці ёсць мабільныя цеплагенеруючыя ўстаноўкі, а таксама падрыхтаваны да работы перасоўныя блока-модульныя кацельні. Створаны аварыйныя брыгады з кругласутачным дзяжурствам на выпадак узнікнення пазаштатных сітуацый. **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** даручыў адказным службам узмацніць кантроль за абследаваннем вентыляцыйных і дымавых каналаў усяго жыллёвага фонду, у тым ліку прыватнага і ведамаснага.

Да таго ж сёлета ў Гомельскай вобласці мадэрнізавалі 84 кацельні. На гэтыя мэты былі выкарыстаны бюджэтныя грошы ў памеры 9,5 мільёна рублёў, таксама ўкладзена звыш 350 тысяч з уласных сродкаў прадпрыемстваў ЖКГ.

Акрамя таго, для замяшчэння імпартуемага прыроднага газу сёлета ў вобласці запланаваны ўвод дзвюх цеплакрыніц на мясцовых відах паліва. У Добрушы кацельня рыхтуецца да пуску ў кастрычніку, а ў Буда-Кашалёве ўвод запланаваны на сярэдзіну лістапада. Па выніках года ў рэгіёне доля мясцовых відаў паліва прагназуецца на ўзроўні каля 45,2 %. На Гомельшчыне створаны запас драўнянага паліва і топачнага мазуту з перавышэннем запланаваных лічбаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ПАДЛІЧЫМ?!

# СПЕЦРАХУНАК АБО ДЭПАЗІТ

## Што выбраць?

**Капітальны рамонт — гэта заўсёды нязручнасці для жыльцоў. Але яны пераносяць іх цярпліва. Бо разумеюць, што пасля заканчэння работ жыць стане больш камфортна.**

У Мінскай вобласці да канца года неабходна капітальна адрамантаваць 360 тысяч квадратных метраў жылфонду. Як запэўніў **дырэктар Дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінскай вобласці» Васіль ШАШОК**, гэтыя паказчыкі будуць выкананы і нават з запасам.

Па яго словах, амаль усе раёны ідуць роўна, план за дзевяць месяцаў практычна выканалі. Хтосьці крыху не дацягвае па аб'ектыўных прычынах.

Сёння капрамонт робіцца згодна з 324-й пастановай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і мае на мэце аднавіць усе характарыстыкі жылога дома, у тым ліку агараджвальныя канструкцыі, інжынерныя сеткі.

—Таму на пражыванне людзей гэта ніякім чынам не ўплывае, — кажа Васіль Васілевіч. —Мы таксама імкнёмся стварыць як мага менш дыскамфорту, у мінімальныя тэрміны — на працягу 3-6 месяцаў — закончыць работы.

— Сёлета нам даведзена заданне капітальна адрамантаваць 15 тысяч квадратных метраў жылога фонду, — расказаў **старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікалай АРЦЮШКЕВІЧ**. — Адзін дом здалі ў ліпені. Яшчэ два дамы хутка завяршым: мяркую, у кастрычніку — лістападзе ўвядзём іх у эксплуатацыю. Акрамя таго, будынак інтэрната на вуліцы Фурманава перадалі на баланс мясцовай ЖКГ. Раней ён належаў Дзяржынскаму вопытна-механічнаму заводу, які далучылі да «Амкадора».

Гэты інтэрнат — калідорнага тыпу. Будынак у дрэнным стане, тут неабходна мяняць інжынерныя сеткі, санвузлы, сістэму водазабеспячэння, правесці бягучы рамонт у памяшканнях. Праект ужо гатовы, заключаны дагавор на выкананне работ. Інтэрнат плануецца давесці да ладу праз шэсць месяцаў. Да канца года шмат што паспеем зрабіць. Астатняе — закончыць налета і здаць цалкам абноўлены будынак у людзей — сакавіку.

***— Капітальны рамонт праводзіцца без адсялення людзей? —*** цікаўлюся ў Мікалая Іванавіча.

— У Жыллёвым кодэксе дакладна прапісана, што грамадзяне, кватэранаймальнікі павінны ўтрымліваць свае памяшканні ў спраўным стане. У жылым доме ўсё робіцца па праекце, рамонт кватэр не прадугледжаны. Жылфонд у нас не стары — 25-27 гадоў пасля будаўніцтва. Таму нейкіх кардынальных перабудоў не патрабуецца. Пры неабходнасці ўладкоўваецца дах. Раней у шматкватэрных дамах ён быў плоскі, цяпер робіцца двухсхільны. Затым вывучаецца сітуацыя з прамярзаннем сцен. Калі ёсць неабходнасць, то ў абавязковым парадку праводзім цеплавую рэабілітацыю. Калі драўляныя вокны сталі непрыдатныя, мяняем на пластыкавыя, — тлумачыць суразмоўнік.

***— І за чый кошт вядзецца капрамонт?***

— Жыллёва-камунальная гаспадарка пералічвае грошы на спецыяльны рахунак. А вось кааператывы павінны выкарыстаць свае грошы паводле ўласнага меркавання, пакласці на дэпазіт у банк або на спецрахунак райвыканкама. Тыя кааператывы, што пералічваюць сродкі на спецрахунак, удзельнічаюць у агульным плане на рамонт жылфонду ўсяго раёна. У тым выпадку, калі падыдзе тэрмін, іх дом уключаць у план і ён будзе рамантавацца з удзелам бюджэтных сродкаў. Да тых грошай, што збіраюцца на спецрахунку, яшчэ прыблізна каля 60 % дабаўляецца з бюджэту. Кааператывы, што захоўваюць грошы на дэпазіце, абавязаны рабіць капрамонт за свае сродкі. Не хапае — няхай складваюцца, заказваюць праект, рамантуюць. Усё гэта прапісана ў Жыллёвым кодэксе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

❍ **У ТЭМУ**

## Менш — газу, больш — свайго паліва

**У Дзяржынску пачне падаваць цяпло рэканструяваная кацельня, якая працуе на шчапе.**

Пра гэта журналістам паведаміў старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікалай Арцюшкевіч перад выязным пасяджэннем Мінаблвыканкама.

«Сёлета ў нас у ацяпляльны сезон будзе працаваць рэканструяваная кацельня на шчапе па вуліцы Пратасава. Мы ўсталявалі два катлы па 2 МВт кожны і такім чынам адышлі ад газу. Падачу цяпла і гарачай вады ў жыллёвы фонд і на іншыя аб'екты кацельня будзе забяспечваць пры тэмпературы да мінус 5 градусаў. У больш халоднае надвор'е давядзецца дадаткова ўключаць два рэзервовыя газавыя катлы, якія таксама ўсталяваны ў памяшканні», — адзначыў кіраўнік мясцовай вертыкалі ўлады.

Дзяржынскі раён да новага ацяпляльнага сезона гатовы на 100 %: усе кацельні спраўныя і адрамантаваныя, заменены цеплатрасы, падрыхтавана паліва. Усяго ў раёне функцыянуе 190 кіламетраў цепласетак, з іх у старым выкананні засталося каля 20 кіламетраў.

**Паводле БелТА.**

# Дзе хутчэй заменяць стары ліфт?

## Ад таго, каму належыць вертыкальны «транспарт», залежыць многае...



**У Брэсцкай вобласці ў 2020 годзе плануецца замяніць 160 ліфтаў. Такая інфармацыя прагучала на прамой лініі са старшынёй аблвыканкама Анатолем ЛІСАМ, якая прайшла напрыканцы мінулага тыдня.**

Мадэрнізацыя ліфтавай гаспадаркі праводзіцца згодна з падпраграмай «Бяспечны ліфт» дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». «Праграма па замене ліфтаў працуе. У вобласці летась замянілі больш за 200 ліфтаў. Перш за ўсё абсталяванне замяняюць у камунальных дамах, якія знаходзяцца на балансе жыллёва-камунальнай гаспадаркі», — расказаў Анатоль Ліс.

На прамую лінію звярнуўся старшыня ЖБВК у Брэсце. Паводле яго слоў, у многіх кааператыўных дамах, якім больш за 30 гадоў, існуе праблема з ліфтамі. «Яны і маральна, і фізічна састарэлі», — канстатаваў старшыня ЖБВК.

Праблема замены ліфтавага абсталявання ў жыллёвым фондзе арганізацый забудоўшчыкаў і таварыстваў уласнікаў існуе, прызнаў **генеральны дырэктар абласнога ўпраўлення ЖКГ Аляксандр МАКСІМЧУК**. «Гэта абумоўлена тым, што пры фарміраванні праграмы не былі ўлічаны ліфты ў дамах ЖБВК і таварыстваў уласнікаў. У сувязі з гэтым у канцы мінулага года ў пастанову Савета Міністраў былі ўнесены змены. Цяпер у праграму ўключаны ліфты і таварыстваў уласнікаў, і ЖБВК. Мы прапануем выконваць мадэрнізацыю на ўмовах сумеснага фінансавання: праектна-каштарысную дакументацыю і частку работ, акрамя закупкі і мантажу ліфта, павінны аплаціць кааператывы», — растлумачыў ён.

Дарэчы, усяго ў Брэсцкай вобласці ў кааператыўных дамах знаходзіцца 408 ліфтаў з перавышэннем нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі (25 гадоў і больш), у тым ліку 33 ліфты, старэйшыя за 40 гадоў. У дамах, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні ЖКГ, засталіся толькі тры такія ліфты. Пры фарміраванні графікаў работ па замене ў 2020 годзе ў вобласці 160 ліфтаў у першую чаргу будзе ўлічвацца зношанасць абсталявання, а таксама гатоўнасць дакументацыі. Цяпер яна падрыхтавана на замену 57 ліфтаў у Пінску і двух — у Лунінцы.

Сёлета ў вобласці неабходна замяніць 170 ліфтаў. За студзень — жнівень заменена 110 ліфтаў на 7,5 мільёна рублёў. Цалкам работы завершаны ў Баранавічах, Пінску, Івацэвічах. У Брэсце заменена пакуль 78 ліфтаў. Прычына — адсутнасць праектна-каштарыснай дакументацыі на пачатак года. Тым не менш гадавое заданне па замене ліфтаў будзе выканана, запэўніў гендырэктар абласнога ўпраўлення ЖКГ.

Усяго на прамую лінію з губернатарам было адрасавана 26 зваротаў. Большасць датычылася пытанняў эксплуатацыі жыллёвага фонду і жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Паводле БелТА.**

**Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 6 ноября 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д.Чуденичи, ул. Осенняя, 8 кадастровый номер 623286308101000475 | 0,1197 | Черта населенного пункта, новый район индивидуальной застройки Имеются сети: водоснабжение, электрификация, газификация | 10 000,00 | 1000,00 | 1571,29 + расходы за размещение объявления |
| 2 | д.Чуденичи, ул. Осенняя, 9 кадастровый номер 623286308101000438 | 0,1215 | Черта населенного пункта, новый район индивидуальной застройки Имеются сети: водоснабжение, электрификация, газификация | 10 000,00 | 1000,00 | расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 6 ноября 2019 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет, контактные телефоны**: 8 (01774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 366 76 48.**
**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 30.10.2019 включительно;
**Для участия в аукционе необходимо:**
1) подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;
2) предоставить квитанцию об уплате суммы задатка;
3) предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.
Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.
**Задаток** перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет.
**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.
Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СПК «ПРОГРЕСС-ВЕРТЕЛИШКИ»**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | ЛОТ № 1 **– капитальное строение, инв. № 400/С-46926** (котельная сокового цеха), составные части и принадлежности (пристройка, склад), кирпичное, 1983 г. п. и 1985 г. п., площадью 124,4 кв. м | | |
| Информация о земельном участке, местонахождение, ограничения (обременения): кадастровый номер 422081303101000513, площадь 0,0353 га, Гродненская обл., Гродненский р-н, Р-145, 13-й км, 5Г, право аренды по 30.07.2111 год | | | |
| Начальная цена | **11 200 руб. 00 коп. с учетом НДС** | Сумма задатка (5 %) | 560 руб. 00 коп. |
| Сведения о продавце: СПК «Прогресс-Вертелишки», Гродненская обл., Гродненский р-н, аг. Вертелишки, ул. Юбилейная, 1, тел. 8(0152) 994335 | | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 62 16 32, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X , УНП 500481906 | | | |
| Срок заключения договора: в течение 20 календарных дней после проведения торгов. Условия оплаты: по договоренности сторон | | | |
| **Торги состоятся 4 ноября 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов | **По 29 октября 2019 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | |
| Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов **www.fincentr.by.** Более подробная информация по тел. в г. Гродно: 8 (0152) 62 16 32 | | | |

❍ Блізкая ўлада

## Ёсць праблема? Тэлефануйце!

**У суботу, 5 кастрычніка, на прамой тэлефоннай лініі Мінаблвыканкама будзе адказваць на пытанні грамадзян старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ. Паведаміць Наталлі Віктараўне пра тое, што хвалюе, можна па тэлефоне 500-41-60 з 9.00 да 12.00.**

# АКЦЭНТ НА РАЗВІЦЦЁ РЭГІЁНАЎ

**Менавіта глыбінка павінна і можа стаць лакаматывам эканамічнага росту як абласцей, так і краіны ў цэлым. Тым больш што для гэтага створаныя ўсе ўмовы, прывабныя для патэнцыйных інвестараў, мясцовых жыхароў, якія жадаюць распачаць сваю справу. Стан недзяржаўнага сектара эканомікі ў апошні час у Віцебскай вобласці не раз быў у цэнтры ўвагі прадстаўнікоў улады рознага ўзроўню. Традыцыйнымі сталі тэматычныя «разборы палётаў» у аблвыканкаме, канферэнцыі, «круглыя сталы», форумы з удзелам адказных асоб і прадпрымальных людзей.**

Нядаўна **старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** на пасяджэнні, дзе абмяркоўваліся пытанні інвестыцый, падкрэсліў: без іх не будзе магчымасці дынамічнага развіцця раёнаў у будучыні. Кіраўнік абласной вертыкалі ўлады нагадаў прысутным, што на сённяшні дзень усе раёны датацыйныя. Добра, што з году ў год працэнт фінансавай залежнасці паменшаецца, але працэс выхаду на большую самастойнасць трэба актывізаваць. І менавіта дзелавая актыўнасць, адкрыццё новых вытворчасцяў і, як вынік, стварэнне рабочых месцаў і рост падатковых паступленняў паспрыяюць устойліваму развіццю рэгіёнаў. На гэта пастаянна звяртае ўвагу кіраўнік дзяржавы, нагадаў старшыня Віцебскага аблвыканкама.

Вельмі плённа прайшла на мінулым тыдні рэгіянальная канферэнцыя KEF-2019 «Беларусь пачынаецца тут». Адзін з яе ўдзельнікаў, **намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ**, канстатаваў, што раней распрацоўваліся канцэпцыі эканамічнага развіцця ў цэлым, але менш увагі звярталася на патрэбы і патэнцыял рэгіёнаў у прыватнасці.

Цяпер сітуацыя іншая: усе адрозненні абласцей трэба ўлічваць, што і робіцца. У міністэрстве гатовыя аказваць усебаковую падтрымку ініцыятывам: калі трэба — нават да прапаноў па зменах у заканадаўстве. Намеснік міністра ўпэўнены, што ўмовы для інвестараў у краіне вельмі прывабныя. Асабліва калі размова ідзе пра магчымасць распачаць бізнес у малых гарадах, сельскіх населеных пунктах. І па-ранейшаму можна добра зарабіць на тэрыторыях свабодных эканамічных зон. Асобная размова пра Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», прыцягальны для бізнесу.

**Старшыня Камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА** паведаміла ўдзельнікам канферэнцыі, што ў Савеце Міністраў добра ацанілі распрацаваную аблвыканкамам стратэгію развіцця Прыдзвіння. Адзін са спосабаў актывізацыі супрацоўніцтва з бізнесам — інвентарызацыя аб'ектаў нерухомасці. У якасці станоўчага прыкладу можна прывесці Аршанскі раён, дзе выявілі дадаткова каля 470 аб'ектаў, якія не выкарыстоўваліся. Адказная асоба лічыць, што ў раёнах трэба арганізаваць па дзве-тры «пляцоўкі», каб туды запрашаць інвестараў для арганізацыі вытворчасці. А дзеля гэтага там павінна быць развітая інфраструктура, трэба прадумаць лагістычныя, вырашыць транспартныя пытанні.



На выстаўцы-кірмашы «Віцебшчына — за здаровы лад жыцця».

Кандыдат эканамічных навук, дацэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Марына Сланімская падзялілася вынікамі апытання дзелавых людзей. Даследаванне меркаванняў 400 рэспандэнтаў вялося на працягу двух гадоў.

Што датычыцца праблем, то прадпрымальнікі адзначылі бюракратыю, залішняе ўмяшанне ў справы бізнесу, адставанне ад часу галіновага заканадаўства, што абмяжоўвае канкурэнцыю. Незадаволеныя бізнесмены і тым, што цяжка кааперавацца з дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Іншыя цяжкасці — вялікія аб'ёмы неплацяжоў за прадукцыю і паслугі, няроўныя ўмовы на ўнутраным рынку для прыватных прадпрыемстваў і прадпрыемстваў з дзяржаўнай формай уласнасці. Усё больш адчуваецца недахоп кваліфікаванага персаналу.

Дарэчы, некалькі слоў пра кадры. Падчас адной з дыскусій прагучала, што 8 % беларускіх студэнтаў з'ехала для працягу вучобы ў Расію і Польшчу. Як правіла, яны рэдка вяртаюцца назад. Таму айчынным вытворцам, фірмам, арганізацыям трэба замацоўваць патэнцыйныя кадры. І не толькі ў Мінску, але і ў Віцебску прыкладаў усё больш, калі недзяржаўныя прадпрыемствы запрашаюць на практыку, каб зацікавіць моладзь працаваць пастаянна...

Галоўнае — прадстаўнікі бізнесу адчуваюць, што ва ўлады ёсць разуменне праблем, і, калі нешта нельга вырашыць на мясцовым узроўні, можна атрымаць падтрымку на абласным і рэспубліканскім. Асабіста кіраўнік краіны не раз казаў, што падтрымае выгадныя праекты, вельмі пільна прыслухоўваецца да «сігналаў» наконт цяжкасцяў ад прадстаўнікоў бізнес-структур, сустракаецца з дзелавымі людзьмі.

Зразумела, дапамагаючы бізнесу, можна зняць з дзяржавы нагрузку ў многіх кірунках. Напрыклад, па аздараўленні стратных прадпрыемстваў. Недзяржаўны сектар эканомікі, калі яго развіваць, можа спрыяць больш актыўнаму вырашэнню сацыяльных праблем. І ў апошнія гады ў Беларусі зроблена нямала, каб тыя, хто займаецца бізнесам або пачынае сваю справу, маглі без валакіты з падтрымкай улады рэалізаваць свае бізнес-ідэі. Хай яшчэ не ўсё ідэальна, але, як кажуць, працэс пайшоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 17.10.2019 повторного аукциона (цена снижена на 50 %)**

**Лот № 1:** 71/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 7, инв. № 1000094300, площадью 26,20 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030092000.
Начальная цена продажи: 6 227,05 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 622,71 руб.
**Лот № 2:** 79/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 8, инв. № 1000094400, площадью 29,40 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030092100.
**Начальная цена продажи: 6 925,05 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 692,51 руб.**
Имущество расположено по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 28г, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003209 общей площадью 0,1032 га. Отдельный земельный участок для обслуживания каждого из лотов не выделен. Шаг аукциона 5 %

**Аукцион состоится 17 октября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений (подаются лично): по 16.10.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевхимволокно», УНП 700117487, Могилевская обл., г. Могилев-35, 8-0222-499-047

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 5 % от конечной цены реализации соответствующего лотав течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Справочно для покупателей:** регистрация купли-продажи доли в РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» будет осуществляться на основании договора купли-продажи, при этом технический паспорт на имущество (долю) не изготавливается. В случае отчуждения приобретенного имущества (доли) другому покупателю преимущественное право его приобретения имеют другие дольщики здания гаражей. При регистрации сделки купли-продажи имущества (доли) необходимым будет условие предоставления Могилевским горисполкомом в аренду земельного участка, на котором расположено имущество

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 07.04.18, от 23.05.18, от 22.06.18, от 12.10.18, 02.03.19, 22.03.19, 04.05.19, 07.08.19, 11.09.19

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, **тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56, Mogilev@ino.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан в Ушачском районе Витебской области**
**Организатор: Веркудский сельский исполнительный комитет**

| Лот | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия* | Сумма подлежащих возмещению затрат на формирование и регистрацию участка, руб. | Начальная цена лота, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2 | д. Городок (участок № 1), Ушачский район, Витебская область, общая площадь 0,2500 га, кадастровый номер № 224980902101000054 | земли в водоохранной зоне озера Паульское (Тётча) | Расходы – 1584,96 плюс затраты на организацию и проведение аукциона | 2000,00 Задаток – 10 % 200,00 |
| 3 | д. Городок (участок № 2), Ушачский район, Витебская область, общая площадь 0,2500 га, кадастровый номер № 224980902101000055 | земли в водоохранной зоне озера Паульское (Тётча) | Расходы – 1648,20 плюс затраты на организацию и проведение аукциона | 2000,00 Задаток – 10 % 200,00 |

* инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.
Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).
1. **АУКЦИОН СОСТОИТСЯ 5 ноября 2019 года в 10.00 в помещении Веркудского сельского исполнительного комитета по адресу: 211493, аг. Веркуды Ушачского р-на Витебской обл., ул. Школьная, д. 12, 1-й этаж.** Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням **с 8.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений и документов **30 октября 2019 г. до 17.00**.
2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.
3. Сумма задатка перечисляется на р/с BY03AKBB36413280200272300000 ф-л № 216, ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Полоцк, код AKBBBY21216, УНН 300007073, код платежа 04901, получатель – Веркудский сельский исполнительный комитет.
Контактные номера тел.: 802158 55424, 802158 55427, факс – 802158 55423.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2019 года.**